Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

9 ЛІСТАПАДА 2023 г. ЧАЦВЕР № 217 (30097)

ЯК «МІЛАША» ДА ПЕРАМОГІ ПРЫВЯЛА

ЧЫРВОНКА

МАРА – БЫЦЬ ГОДНЫМ КІРАЎНІКОМ

ЧЫРВОНКА

## ЦЫТАТА ДНЯ

**Канстанцін ШУЛЬГАН, міністр сувязі і інфарматызацыі:**

*«Укараненне новых тэхналогій у любой галіне немагчымае без забеспячэння інфармацыйнай бяспекі. Гэта той складнік, які дазваляе звычайным карыстальнікам атрымліваць усе паслугі бяспечна і з камфортам. Гэта работа не можа быць статычнай, таму што сістэма інфармбяспекі пастаянна дапрацоўваецца з улікам новых пагроз і выклікаў».*

# На палацавай вышыні

Фота БелТА.

Рэстаўрацыйныя работы ў Ружанскім палацы ідуць ужо не адзін год — раскошную рэзідэнцыю Сапегаў адраджаюць літаральна з руін. Цяпер рэстаўратары карпатліва ўзнаўляюць усходні, ці тэатральны, корпус. Калі работы завершацца, там плануюць зрабіць шматфункцыянальны культурны комплекс, невялікі гатэль і кафэ. Людзі працуюць як звонку, так і ўнутры ўсходняга корпуса. «Выконваем складаныя элементы, цягі робім, працуем спецыяльнымі рэстаўрацыйнымі растворамі. Тут вялікі фронт работ. На зіму, напэўна, плануюцца работы з дрэвам, будзем рабіць столі, унутры тынкаваць. Звонку ж будзем працаваць, пакуль дазваляе надвор'е», — растлумачыў тынкоўшчык Раман БАРЫСЮК *(на фота)*, які працуе на рэстаўрацыі амаль два гады. Праца гэтая цікавая, хоць і няпростая, гаворыць ён: «Вельмі шмат элементаў. Стараемся зрабіць усё якасна, па тэхналогіях і па сумленні».

## КАРАТКА

- **Дэлегацыя Вышэйшага судовага савета Ірака наведвае Беларусь.**
- Конкурс на найлепшыя тавары Беларусі на рынку Расіі правядуць у 2024 годзе.
- **Буйны жывёлагадоўчы комплекс адкрылі ў Кобрынскім раёне.**
- Пяць новых УГД-апаратаў і дзве відэаэндаскапічныя сістэмы атрымалі медустановы Гродзенскай вобласці.
- **У Мсціславе вядзецца рэканструкцыя помніка археалогіі XII стагоддзя на Замкавай гары.**
- «Брэстмаш» наладзіў выпуск школьных мікрааўтобусаў.
- **Мабільны каток каля Палаца спорту ў Мінску плануе адкрыць сезон 17 лістапада.**
- Канцэрт да 35-годдзя Дзяржаўнага камернага хору прадставяць у Белдзяржфілармоніі 9 лістапада.

Харчовая бяспека

## Нашы прадукты да Японіі давязуць

### А на выставе «Прадэкспа» будзе амаль 130 экспанентаў

**Напярэдадні прафесійнага свята — Дня работнікаў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці — аграрыі краіны па традыцыі падводзяць вынікі сельскагаспадарчага года. Хоць гэта і досыць умоўна, бо праца на зямлі не спыняецца ніколі. Адным з такіх спосабаў падвядзення вынікаў з'яўляецца выстава «ПРАДЭКСПА», якая пройдзе з 14 да 17 лістапада ў Мінску. Яна акумулюе ўсё тое, што зроблена і назапашана руплівымі рукамі хлебаробаў.**

### Пашыраем геаграфію экспарту

Як неаднаразова адзначаў **міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Сяргей БАРТАШ**, экспарт айчыннай прадукцыі, пошук новых рынкаў збыту і вектараў гандлёвых стасункаў заўсёды былі аднымі з прыярытэтных кірункаў дзейнасці ведамства. Дарэчы, сёлета асноўнымі імпарцёрамі беларускай сельскагаспадарчай прадукцыі сталі Расійская Федэрацыя і іншыя краіны СНД. Выраслі пастаўкі ў краіны Азіі, у тым ліку ў Кітай, асобныя краіны Афрыкі. Калі ж казаць увогуле, то геаграфія экспарту даволі шырокая, а найбольш далёкія яе кропкі — Мексіка, Куба, КНДР, Японія, Аўстралія.

СТАР. 2

## Бязлітасны агонь і саманадзейныя людзі

### Да чаго прыводзіць непатушаная цыгарэта?

Фота прэс-службы МНС.

**Практычна кожны дзень, а то і па некалькі разоў у суткі ў розных куточках краіны чуваць гук пажарнай сірэны. Гэта ратавальнікі спяшаюцца на чарговае паведамленне аб узгаранні. У пошуку пацярпелых яны адважна заходзяць у ахопленыя полымем хаты і кватэры — і нярэдка выносяць на руках нежывое цела...**

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

У НОВЫ ГОД – СА СТАРЫМ СЯБРАМ!

Ідзе падпіска на I паўгоддзе 2024 года.

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2024 года, у падарунак чатыры календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «МЫ ДА ГЭТАГА ЧАСУ НЕ ЗАДЗЕЙНІЧАЛІ ЗНАЧНУЮ ЧАСТКУ НАШАГА ПАТЭНЦЫЯЛУ»

## Ад прамысловасці да турызму — рэзерваў супрацоўніцтва са Стаўрапольскім краем мноства

**Першая сустрэча за шэсць гадоў Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з губернатарам Стаўрапольскага краю Уладзімірам Уладзіміравым прайшла ў Палацы Незалежнасці. Дэлегацыя краю ў гэтыя дні з візітам знаходзіцца ў нашай краіне. «Думаю, вы добра разумееце, што ў цяперашніх умовах вельмі важна мець побач надзейных саюзнікаў, праверaных. Вы для нас з'яўляецеся менавіта такімі прыхільнікамі, саюзнікамі, на якіх можна абаперціся», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да расійскага госця.**

Прэзідэнт нагадаў, што падчас мінулага візіту Уладзіміра Уладзіміравіча ў 2017 годзе быў вызначаны шэраг перспектыўных напрамкаў для развіцця супрацоўніцтва. Перш за ўсё яны датычацца стварэння сумесных прадпрыемстваў па вытворчасці машын і агрэгатаў, пашырэння паставак беларускай тэхнікі, будаўнічых і аддзелачных матэрыялаў, абмену харчовай прадукцыяй, партнёрства ў сферы АПК, узаемадзеяння ў галіне навукі. Як падкрэсліў беларускі лідар, поспехі, безумоўна, ёсць. Аб гэтым, па яго словах, красамоўна сведчаць лічбы гандлёвай статыстыкі. Па выніках мінулага года тавараабарот вырас больш як на 75 працэнтаў. Вынікі васьмі месяцаў сёлета таксама выклікаюць аптымізм: 130 працэнтаў да гэтага ж перыяду мінулага года.

«Тым не менш я мяркую, што мы да гэтага часу не задзейнічалі значную частку нашага патэнцыялу для пашырэння супрацоўніцтва, — заўважыў беларускі лідар. — Стаўрапольскі край у Беларусі заўсёды ўспрымаўся як жытніца, рэгіён з багатымі традыцыямі і высокай культурай сельскай гаспадаркі. У савецкі час мы многаму вучыліся ў вас. Мы ўважліва сочым за вашымі поспехамі ў садоўніцтве і селекцыі пладовых культур, авечкагадоўлі. Гатовы разглядаць магчымасць абмену вопытам і рэалізацыі сумесных праектаў. Са свайго боку нам таксама ёсць што прапанаваць — пачынаючы з найноўшых тэхналогій у раслінаводстве і селекцыйнай рабоце, паставак насення і пасадачнага матэрыялу, заканчваючы абменам вопытам і падрыхтоўкай прафесійных кадраў для АПК».

Гаворачы аб супрацоўніцтве ў сферы прамысловасці, Аляксандр Лукашэнка адзначыў вялікі аб'ём беларускай сельскагаспадарчай тэхнікі, якая выкарыстоўваецца на Стаўраполлі: па трактарах гэта 56 працэнтаў, камбайнах — каля 10 працэнтаў. «Але ў нас з вамі вялікія планы. Мы вырашылі больш сур'ёзна замацавацца на поўдні Расіі, які мае пераважна сельскагаспадарчую спецыялізацыю эканомікі, і стварыць у Стаўрапалі мультыбрэндавы гандлёва-сэрвісны цэнтр. Ён дазволіць вашым аграрыям і камунальнікам лепш пазнаёміцца з усім асартыментам прадукцыі беларускіх вытворцаў, набыць без лішніх пасрэднікаў машыны, якія цікавяць, і своечасова атрымаць прафесійныя сэрвісныя паслугі», — сказаў ён.

У праграме візіту дэлегацыі Стаўрапольскага краю — наведванне Мінскага трактарнага завода. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу губернатара, што на прадпрыемстве распрацавалі новую мадэль трактара для садоў і вінаграднікаў. Ён выказаў меркаванне, што гасцям гэта будзе цікава.

Па словах Прэзідэнта, акрамя паставак сельскагаспадарчай тэхнікі, беларускі бок зацікаўлены і гатовы ўдзельнічаць у мадэрнізацыі паркаў пасажырскай, спецыяльнай і камунальнай тэхнікі.

Аляксандр Лукашэнка таксама прапанаваў даручыць урадам да канца года ўнесці канкрэтныя прапановы па арганізацыі ў Стаўрапольскім рэгіёне вытворчасцяў асобных відаў машынабудаўнічай прадукцыі.

Яшчэ адзін напрамак супрацоўніцтва, адзначаны кіраўніком дзяржавы, — турызм і турыстычная інфраструктура: «Усім вядомыя вашы знакамітыя курорты з мінеральнымі водамі: Пяцігорск, Кіславодск, Есентукі, якія карыстаюцца вялікім попытам, у тым ліку і ў беларусаў. Мы гэта таксама з савецкіх часоў ведаем і памятаем. Мы таксама гатовы ўнесці ўклад у развіццё галіны. У нас ёсць магчымасць пастаўляць у рэгіён зборныя драўляныя каркасна-панэльныя канструкцыі і экалагічную мэблю для гасцявых дамоў і вашых атэляў». Аляксандр Лукашэнка прапанаваў падумаць, як можна павялічыць узаемны турпаток, актывізаваць прамыя кантакты паміж установамі санаторна-курортнага тыпу, профільнымі органамі кіравання і арганізацыямі. «На мой погляд, мае сэнс, калі вы палічыце патрэбным, з вашай падтрымкай з мая 2024 года аднавіць прамы авіярэйс паміж Мінскам і Мінеральнымі Водамі. Адпачывальнікі і турысты нам за гэта скажуць дзякуй», — прапанаваў беларускі лідар.

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, апроч эканомікі ёсць мноства іншых сфер, дзе Беларусь і Стаўрапольскі край могуць і павінны цесна супрацоўнічаць: навука, культура, адукацыя, спорт. Па яго словах, магчымасці тут вельмі вялікія. Асабліва адзначыў Прэзідэнт тэму патрыятычнага выхавання і захавання памяці аб Вялікай Айчыннай вайне. У многім дзякуючы ініцыятыве стаўрапольцаў у расійскім календары нядаўна з'явіўся новы дзень воінскай славы — Дзень разгрому савецкімі войскамі нямецка-фашысцкіх войскаў у бітве за Каўказ. У кастрычніку адзначалася 80-годдзе слаўнай падзеі. «Гэты дзень шмат у чым і наша свята. Таму што разам ваявалі, разам змагаліся. І за Каўказ змагалася нямала беларусаў. І сёння ў Беларусі свята шануюць памяць нашых герояў», — сказаў Прэзідэнт.

«Насамрэч кола пытанняў, якія цікавяць нас, значна шырэйшае, чым тое, пра якое я сказаў. Мы гатовы па ўсіх напрамках супрацоўнічаць з вамі. Калі вы знойдзеце ў Беларусі нешта цікавае, вы скажыце, мы заўсёды адрэагуем настолькі, наколькі гэта магчыма. А калі дамовімся, свята будзем выконваць нашы дамоўленасці», — запэўніў Аляксандр Лукашэнка.

Уладзімір Уладзіміраў у сваю чаргу адзначыў: «Мы зацікаўлены ў працягу супрацоўніцтва. Дзякуй вам за тое, што вы ўзгадняеце адкрыццё вялікага мультыбрэндавага цэнтра на тэрыторыі Стаўрапольскага краю. Упэўнены, што па выніках яго работы мы зможам працягнуць перагаворы, звязаныя з магчымасцямі лакалізацыі вытворчасці тэхнікі Рэспублікі Беларусь на тэрыторыі Стаўрапольскага краю. У гэтым мы крайне зацікаўлены, таму што сёння ўсе гэтыя сыходы-выхады недружалюбных краін з рынку нам паказалі, што трэба максімальна арыентавацца на доўгатэрміновыя дамоўленасці паміж Беларуссю і Стаўрапольскім краем».

**Валерыя СЦЯЦКО.**

### У тэму

#### Дзякуючы Беларусі, Стаўрапольскі край фактычна не адчуў уплыў санкцый

У размове з журналістамі губернатар Стаўрапольскага краю падкрэсліў, што існуе яшчэ шэраг рэзерваў для супрацоўніцтва з Беларуссю. Першы з іх вызначылі Прэзідэнты Беларусі і Расіі — імпартазамяшчэнне. «Дзякуючы машынабудаўнічаму комплексу Беларусі, Стаўрапольскі край фактычна не адчуў негатыўны ўплыў санкцый, якія незаконна былі ўведзены супраць Расіі. Машынабудаўнічы комплекс Беларусі падтрымаў сельскую гаспадарку краю. Тавараабарот павялічыўся практычна ў два разы. У Стаўрапольскім краі з'явіцца мультымадальны дылерскі цэнтр, гэта значыць з'явіцца прадстаўніцтва ўсіх брэндаў сельгастэхнікі Беларусі. Мы вельмі зацікаўлены ў дарожнай, будаўнічай тэхніцы. Яшчэ адным рэзервам бачыцца супрацоўніцтва ў ваеннай сферы, узаемныя пастаўкі абмундзіравання», — сказаў ён. Па словах Уладзіміра Уладзіміравіча, у сельскай гаспадарцы перспектыўным бачыцца партнёрства ў селекцыйнай рабоце, узнаўленні высокапрадукцыйнага племяннога статка. На сустрэчы з Прэзідэнтам гучала прапанова ў маі наступнага года ўзнавіць авіярэйс. «Пастараемся гэта ўсё паскорыць. Тым больш Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін вельмі актыўна падтрымлівае гэтыя сяброўскія сувязі», — сказаў губернатар.

# Нашы прадукты да Японіі давязуць

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Цікавасць да беларускіх прадуктаў пацвярджае і састаў удзельнікаў сёлетняй 29-й Міжнароднай выставы-кірмашу «ПРАДЭКСПА-2023». На агульнай плошчы ў 1300 м² размесціцца 126 экспанентаў з пяці краін свету. У мінулым годзе іх было 110. Адметна і тое, што павышаецца інтарэс да выставы з боку рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі — яны будуць прадстаўлены на 10 тэматычных экспазіцыях, што таксама больш, чым летась.

### Выдатная пляцоўка для новых кантрактаў

Беларускія вытворцы прадставяць як ужо знаёмую прадукцыю, якую любяць многія, так і свае навінкі. Будзе прадстаўлены практычна ўвесь асартымент прадуктаў харчавання, напояў. Відовішчнымі абяцаюць быць стэнды Белкаапсаюза, Белдзяржхарчпрама, Нацыянальнай акадэміі навук. Асобныя блокі выставы прысвечаны перапрацоўчаму абсталяванню, тары і ўпакоўкі для прадуктаў. Пры ўсім гэтым, як падкрэсліла **вядучы спецыяліст сектара інавацыйна-тэхналагічных праектаў прадпрыемства «БелЭкспа» Вікторыя МІКАЛЮК**, «ПРАДЭКСПА» — у першую чаргу спецыялізаваная выстава для прафесіяналаў галіны. І менавіта на іх скіравана дзелавая праграма мерапрыемства. А яна досыць насычаная. На працягу ўсіх чатырох дзён работы выставы яе ўдзельнікаў чакаюць круглыя сталы, майстар-класы, прэзентацыі прадукцыі і абсталявання. Асобная ўвага, канешне, перагаворам аб супрацоўніцтве.

Па словах **начальніка галоўнага ўпраўлення знешнеэканамічнай дзейнасці Мінсельгасхарча Ксеніі МЯЛЕШКА**, сёлета айчынныя вытворцы змогуць правесці перагаворы з прадстаўнікамі больш як 35 гандлёвых сетак не толькі краін СНД, але і далёкага замежжа. Гэта выдатная магчымасць для заключэння новых кантрактаў і пашырэння рынкаў збыту. Яна таксама адзначыла, што папулярнасць беларускага «ПРАДЭКСПА» расце з кожным годам, пацвярджаючы тым самым агульнавядомы ўжо факт: беларускія прадукты харчавання — гэта заўсёды якасна, натуральна і смачна.

### Прыходзьце на «Смакату»!

Нельга не згадаць і тое, што падчас выставы пройдзе шэраг разнастайных прафесійных конкурсаў: «Высокая мода ў кандытарскім мастацтве», «Міжнародны чэмпіянат кандытарскага мастацтва — 2023», «Міжнародны кулінарны кубак 2023», міжнародны конкурс на найлепшую ўпакоўку «СмакАрт 2023», рэспубліканскі агляд якасці хлебабулачных і кандытарскіх вырабаў «СМАКАТА-2023». А безумоўным упрыгожаннем выставы стане фэст «Кухні народаў свету», удзел у якім прымуць кулінары з пяці краін свету, у тым ліку з Індыі, Пакістана, В'етнама... Карацей, будзе што не толькі паглядзець, але і пакаштаваць.

**Уладзімір ВЯРЭНІЧ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Генеральны сакратар ААН заклікаў сабраць $1,2 млрд на гуманітарную дапамогу сектару Газа

Антоніу Гутэрыш заявіў, што наспела вострая неабходнасць рэзка павялічыць паток дапамогі сектару Газа, які сутыкнуўся з гуманітарнай катастрофай. Ён паведаміў, што «Арганізацыя Аб'яднаных Нацый і нашы партнёры запускаюць гуманітарны заклік на суму $1,2 млрд, каб дапамагчы 2,7 мільёна чалавек — гэта ўсё насельніцтва сектара Газа і паўмільёна палесцінцаў на Заходнім беразе, уключаючы Усходні Іерусалім. Бакі канфлікту — і, па сутнасці, міжнародная супольнасць — нясуць непасрэдную і фундаментальную адказнасць, трэба пакласці канец бесчалавечным калектыўным пакутам і рэзка пашырыць гуманітарную дапамогу Газе». Як адзначыў Антоніу Гутэрыш, некаторая жыццёва неабходная дапамога паступае ў Газу з Егіпта праз кантрольна-прапускны пункт Рафах. «Але ручаёк дапамогі не пакрывае акіяна патрэб», — заўважыў ён.

### Італія будзе адпраўляць нелегальных мігрантаў у Албанію

Італія пабудуе ў Албаніі два цэнтры для прыёму мігрантаў, якія прыбываюць у Еўропу морам, заявіла прэм'ер-міністр краіны Джорджа Мелані, паведаміла «Бі-бі-сі». Такім чынам італьянскія ўлады разлічваюць скараціць у сябе колькасць нелегалаў, якая амаль падвоілася за мінулы год. Цэнтры адкрыюцца ў партовым горадзе Шэнгіні і ў адным з гарадоў у цэнтры краіны (дзе менавіта, пакуль не ўдакладняецца) і будуць знаходзіцца ў італьянскай юрысдыкцыі. Па словах Мелані, адкрыццё запланавана на вясну 2024 года. На першым этапе яны прымуць каля трох тысяч чалавек, але ў далейшым плануецца пашырыць іх умяшчальнасць да 36 тысяч мігрантаў за год. Многія праваабаронцы параўноўваюць планы Італіі з праграмай брытанскага ўрада, распрацаванай летась для барацьбы з нелегальнай міграцыяй. У рамках гэтай праграмы людзей, якія змаглі перасекчы Ла-Манш у пошуках палітычнага прытулку ў Вялікабрытаніі, перапраўляюць у Руанду.

### Астраномы выявілі найстаражытнейшую чорную дзірку

Яна з'явілася праз 470 мільёнаў гадоў пасля Вялікага выбуху, паведаміў часопіс Nature Astronomy. Адкрыццё пацвярджае тэорыю пра тое, што звышмасіўныя чорныя дзіркі маглі існаваць на пачатку Сусвету. З-за вялікай яркасці і актыўнага росту навукоўцы лічаць гэты аб'ект квазарам, гэта значыць, адным з самых яркіх астранамічных аб'ектаў. Меркаваны ўзрост чорнай дзіркі — 13,2 млрд гадоў, пры тым што Сусвет утварыўся 13,7 млрд гадоў таму. Маса знойдзенага аб'екта складае ад 10 да 100 працэнтаў масы ўсіх зорак у галактыцы UHZ1, у якой і знаходзіцца гэтая чорная дзірка. Інфрачырвоны касмічны тэлескоп «Джэймс Уэб» змог убачыць свячэнне галактыкі дзякуючы эфекту гравітацыйнага лінзавання, які павялічыў святло ў некалькі разоў. Пасля гэтага касмічная абсерваторыя «Чандра», якая дазваляе атрымліваць выявы ў рэнтгенаўскім спектры, злавіла выпраменьванне, якое выпускаецца газам вакол чорнай дзіркі.

Асоба

# «Місія — рабіць дабро»

## Ветэрана вайны Валянціну Баранаву ўрачыста павіншавалі са 100-гадовым юбілеем

**Гэту жанчыну па праве можна назваць легендай. І хаця ў яе, былой франтавой сувязісткі, ветэрана Вялікай Айчыннай вайны, за плячыма ўжо цэлае стагоддзе, Валянціна Пятроўна не выглядае на свой узрост. Мабыць, таму, што займае актыўную жыццёвую пазіцыю, не тоіць у сабе злосці, з аптымізмам і гумарам ставіцца да наваколля і можа пажартаваць адносна свайго, такога ганаровага, узросту.**

Фота Белтă.

Вось і падчас урачыстасці з нагоды стагадовага юбілею ў Валянціны Баранавай не сыходзіла з вуснаў усмешка. Кожнага, хто падыходзіў да яе, шчыра вітала. Здаецца, сярод прысутных, якіх нямала сабралася ў раскошным старажытным палацы, не было раўнадушных да гэтай стойкай і мужнай жанчыны. Павітаць заслужаную і ганаровую гродзенку прыйшлі кіраўнікі вобласці, грамадскіх арганізацый, прадпрыемстваў і ўстаноў. З журналістамі юбілярша падзялілася сакрэтам свайго настрою.

— Я па натуры аптыміст, хаця ў маёй біяграфіі было вельмі шмат драматычных і трагічных момантаў. Але не варта трымаць гэта на твары, няхай наша сэрца перажывае, а нервы трэба трымаць пры сабе. Мы павінны жыць момантам, — зазначыла Валянціна Пятроўна. — І чаму я сёння такая вясёлая, усмешлівая, радасная? Таму што ведаю, што жыву ў свабоднай краіне, моцнай і незалежнай, а галоўнае — міралюбівай. Нездарма наш Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка паставіў такую задачу: весці барацьбу за мір не толькі ў нас, але і на ўсёй зямлі. Мы ўсе павінны быць салідарныя ў тым, каб захаваць мір, жыць у любові, дабрыні, радасці.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў ветэрана Вялікай Айчыннай вайны Валянціну Баранаву са 100-гадовым юбілеем

«Сімвалічна, што гэтую знамянальную дату вы адзначаеце ў Год міру і стваральнай працы, цану якім ведаеце з уласнага досведу, — гаворыцца ў віншаванні. — Мужнасцю, гераізмам, устойлівасцю і адвагай адзначаны вашы вогненныя вёрсты, пройдзеныя за гады Вялікай Айчыннай вайны».

Сапраўдным узорам самаахвярнага служэння Айчыне стала і наступная працоўная біяграфія Валянціны Пятроўны, адзначыў кіраўнік дзяржавы. «З'яўляючыся захавальнікам і прапаведнікам гістарычнай праўды, вы даносіце яе да пакаленняў, якія не спазналі жахаў вайны. Валодаючы жыццёвай мудрасцю і выключным абаяннем, несяце ў грамадства ідэі любові, дабра і справядлівасці», — падкрэсліў Прэзідэнт у віншавальным пасланні і пажадаў добрага здароўя, дабрабыту, радасці і шчасця пад мірным небам Беларусі.

У дзяцінстве Валянціна Пятроўна марыла стаць артысткай. У 1941 годзе яна скончыла школу ў Абакане, куды ў 30-я гады пераехалі бацькі з Краснаярскага краю. Увесь клас ішоў сустракаць світанак, а раніцай даведаліся, што пачалася вайна. Праз год 18-гадовай дзяўчынай яна пайшла на фронт. Служыла ў якасці памочніка камандзіра ўзвода, начальніка змены ваенна-тэлеграфнай станцыі. Яе баявы шлях ляжаў па Украіне, Польшчы, Германіі. Перамогу сустрэла ў Празе. Сведкі гэтага шляху — ордэн Чырвонай Зоркі, ордэн Айчыннай вайны II ступені, медалі «За баявыя заслугі», « За вызваленне Прагі», «За перамогу над Германіяй». У маі гэтага года атрымала з рук Прэзідэнта ордэн Пашаны.

Старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Каранік упэўнены, што сакрэт даўгалецця 100-гадовай юбіляршы ў тым, што ў яе сэрцы жыве любоў. У першую чаргу, да Радзімы, якую абараняла са зброяй у руках. Вядома, гэта любоў да людзей. Валянціна Баранава не стала рызыкаваць жыццём маладога байца і сама адправілася выпраўляць разрыў сувязі на лініі фронту. Яе мужнасць атрымала дастойную ўзнагароду — ордэн Чырвонай Зоркі. Адзначалася яе любоў да падрастаючага пакалення, з якім жанчыну звязваюць доўгія гады педагагічнай працы.

— Як чалавек з медыцынскай адукацыяй хачу сказаць, што гэта яшчэ не мяжа — 100 гадоў. Мы спадзяёмся, што будзем сустракацца на розных мерапрыемствах і яшчэ неаднойчы выказваць вам словы падзякі, — з упэўненасцю рэзюмаваў кіраўнік рэгіёна.

І ўсё ж у нашай гераіні ёсць і свой асабісты сакрэт даўгалецця, аб якім яна расказала журналістам з доляй жарту.

— Я ўвесь час сачыла за спінай. З трох гадоў. Маці мне заўсёды казала: як ты трымаеш спіну? А яшчэ балерынай хочаш быць! Гэта фраза засталася на ўсё жыццё. Бо дома стаіш нахіліўшыся: над плітой, над сталом ці падлогу мыеш. Таму выйшлі на вуліцу і далі сабе сігнал: трымай роўна спіну! А ведаеце, чаму? Таму што хрыбет напоўнены нервамі. Як чалавек сагнуўся, пазванкі сціскаюць нейкую частку нервовай сістэмы, і яна блакіруецца. Ад гэтага ўсе хваробы. Выходзіце з дома — спіну выпрамляйце.

Гэта жанчына — крыніца мудрых і слушных парад, у якіх глыбокая жыццёвая пазіцыя сумленнага і вельмі прыстойнага чалавека. «Яе місія — дабрыня», — зазначыла дачка Наталля. І прыгадала, што маці нікога не адпусціць, пакуль не пачастуе сваімі знакамітымі рагалікамі з грэцкімі арэхамі. А іх яна выпякае кожны тыдзень.

«Я ўся прасякнутая патрыятызмам», — сказала нядаўна падчас нашай сустрэчы Валянціна Пятроўна. Вось і цяпер, у свой 100-гадовы юбілей, яна зноў вяртаецца да гэтай тэмы і жадае сваім нашчадкам шанаваць сваю краіну, рабіць для яе росквіту ўсё, што магчыма.

— Калі ўвесь народ адзін за ўсіх і ўсе за аднаго, тады мы зможам зрабіць нешта сапраўды моцнае для сваёй краіны. Але толькі калі мы разам, у адным страі, — падкрэсліла юбілярша.

Аб сваіх планах сказала так: «Я, канешне, пайду такім страявым крокам наперад, а далей буду спадзявацца на Усявышняга».

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

У люстэрку статыстыкі

# Тэлевізар або газеты і кнігі?

**З мэтай вывучэння грамадскай думкі аб праблемах, якія хвалююць насельніцтва пенсіёнага ўзросту, Інстытутам сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ў ліпені — жніўні 2023 года было праведзена тэлефоннае апытанне. Даследаванне ахапіла ўсе абласныя гарады, Мінск, асобныя раённыя цэнтры і сельскія населеныя пункты (памылка выбаркі складае +4,0 %). У апытанні прынялі ўдзел асобы ва ўзросце ад 58 гадоў. Выбарачная сукупнасць склала 601 рэспандэнт.**

### АЦЭНКА СТАНУ ЗДАРОЎЯ

Ацэньваючы па пяцібальнай шкале стан уласнага здароўя, кожны другі апытаны пенсіянер называе яго сярэднім — ацэнка ў тры балы (51,6 %), а кожны чацвёрты (25 %) — добрым (сума варыянтаў адказу «чатыры» і «пяць»). На дрэнны стан здароўя ўказалі 18,9 % рэспандэнтаў (сума варыянтаў адказу «адзін» і «два»). Не змаглі адказаць на пытанне 4,5 % рэспандэнтаў.

Удзельнікі апытання не толькі непакояцца аб стане ўласнага здароўя, але і прымаюць актыўныя прафілактычныя меры, якія яго падтрымліваюць. Кожны другі пенсіянер выконвае рэкамендацыі ўрача (50,8 %), а 45,1 % аддаюць перавагу актыўнаму ладу жыцця. Кожны трэці ўважліва сочыць за ўласным харчаваннем (33,5 %), рэгулярна праходзіць медыцынскі агляд і дыспансерызацыю (31 %). Таксама рэспандэнты імкнуцца менш нервавацца (28,4 %), прымаюць прэпараты, якія павышаюць імунітэт (24,1 %), пазбягаюць шкодных звычак (21,1 %), выконваюць рэжым дня (18, 3 %), займаюцца фізкультурай, спортам (17,8 %). Іншыя карысныя звычкі маюць 6,2 % удзельнікаў апытання. Толькі 3,6 % апытаных указалі, што асабліва нічога не робяць для клопату аб сваім здароўі. Не змаглі адказаць на пытанне 3 % апытаных.

### АРГАНІЗАЦЫЯ ВОЛЬНАГА ЧАСУ

Свой вольны час жыхары пенсіённага ўзросту часцей за ўсё праводзяць за праглядам тэлевізара, праслухоўваннем радыё (55,4 %), а таксама займаючыся садам, агародам, дапаможнай гаспадаркай (53,2 %).

Таксама ўдзельнікі апытання адзначылі, што здзяйсняюць прагулкі на свежым паветры (41,3 %), чытаюць кнігі, часопісы і газеты (33,4 %), кантактуюць з сябрамі і сваякамі (29,6 %), бавяць час з сям'ёй (23,2 %).

У якасці вольнага часу ўдзельнікі апытання таксама выбіраюць творчасць (12,9 %) і наведванне культурна-масавых мерапрыемстваў (8,9 %). Значна радзей рэспандэнты ў вольны час займаюцца паляваннем і рыбалкай (5,5 %), спортам і фізкультурай (5,4 %), падарожнічаюць (3,3 %). Варыянт адказу «Іншае» выбралі 11,9 % удзельнікаў апытання.

### ІНФАРМАВАНАСЦЬ АБ ПАГРОЗЕ МАХЛЯРСТВА

Даныя апытання паказалі, што з выпадкамі махлярства сутыкаліся 43,8 % апытаных пенсіянераў, не сутыкаліся — 56,2 %. Большасць тых, хто сутыкнуўся з махлярствам, не панеслі ніякай шкоды (83,6 %). Пры гэтым 16,4 % апытаных прызналіся, што пацярпелі ад дзейнасці ашуканцаў.

Насельніцтва пенсіённага ўзросту ўсведамляе, што ў выпадку пападання ў ашуканскія схемы неабходна звяртацца па дапамогу кампетэнтных органаў. Большасць удзельнікаў апытання ў такіх сітуацыях выбіраюць зварот у міліцыю (78,2 %). Скарыстаюцца дапамогай сяброў або сваякоў 11,6 % рэспандэнтаў, звернуцца ў службу сацыяльнай абароны 1,5 % апытаных, у грамадскія арганізацыі — 0,3 %. Толькі 6,3 % апытаных адзначаюць, што ў выпадку сутыкнення з махлярствам не будуць звяртацца па дапамогу. Не змаглі адказаць на пастаўленае пытанне 5 % рэспандэнтаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Анонс

# КУПАЛАЎСКІЯ ЧЫТАННІ — У КУПАЛАЎСКІМ УНІВЕРСІТЭЦЕ

**17 лістапада Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы правядзе навуковую канферэнцыю «Рэспубліканскія навуковыя чытанні».**

Акрамя пленарнага пасяджэння, якое адкрые прывітальным словам рэктар універсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Ірына Кітурка, работа канферэнцыі будзе праходзіць па тэматычных секцыях: «Агульныя праблемы купалазнаўства»; «Актуальныя праблемы літаратуразнаўства»; «Актуальныя праблемы мовазнаўства і дыдактыкі», «Актуальныя праблемы супастаўляльнага мовазнаўства», «Студэнцкая навука ў гонар Янкі Купалы».

У склад арганізацыйнага камітэта канферэнцыі ўвайшлі дасведчаныя навукоўцы не толькі з Гродзенскага ўніверсітэта, але і вучоныя з Мінска і Брэста. У пленарным пасяджэнні, рабоце секцый прымуць удзел і члены Саюза пісьменнікаў Беларусі — старшыня секцыі крытыкі і літаратуразнаўства СПБ доктар філалагічных навук Валерый Максімовіч, кандыдат філалагічных навук Аліна Сабуць, краязнаўца з Карэліч Святлана Кошур, намеснік старшыні Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ Дзмітрый Радзівончык і інш.

Даволі цікавымі падаюцца заяўленыя студэнтамі тэмы выступленняў, прысвечаныя беларускай літаратуры: «Семантыка-структурныя асаблівасці бязэквівалентнай лексікі ў паэме «Новая зямля» Якуба Коласа (на прыкладзе субстантыва)» С. Міхаловіч, «Мадэль «восені» ў «жаночай» лірыцы Людмілы Кебіч» В. Рымко, «Мастацкі почырк Яўгеніі Янішчыц: слова літаратурнай крытыкі» Д. Шабельскай.

**Сяргей ШЫЧКО.**

# Бязлітасны агонь і саманадзейныя людзі

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пік пажараў з гібеллю людзей у жыллёвым фондзе прыходзіцца на кастрычнік — красавік. Гэта звязана з больш актыўнай эксплуатацыяй пячнога абсталявання і электрасетак. Многіх надзвычайных сітуацый можна было б пазбегнуць, калі б людзі загадзя рыхтаваліся да пахаладання: праверылі і пры неабходнасці адрамантавалі печ, упэўніліся ў надзейнасці электраправодкі і абагравальных прыбораў. Праўда, мала толькі праверыць. Да трагічных наступстваў нярэдка прыводзіць і грэбаванне правіламі пажарнай бяспекі пры эксплуатацыі печы і электрапрыбораў. Што датычыцца печы, гаспадары дапускаюць яе перагрэў, рана зачыняюць засланку, не клапоцяцца аб перадтопачным лісце, які ўратуе ад раптоўнай іскры.

Аднак большасці пажараў можна было б пазбегнуць, калі б людзі вялі здаровы лад жыцця: не курылі ў памяшканні, не выпівалі пры гэтым.

Статыстыка несуцяшальная: сёлета практычна кожны другі загінулы на пажары знаходзіўся ў стане алкагольнага ап'янення. Усяго па прычыне неасцярожнага абыходжання з агнём падчас курэння загінула 245 чалавек. Пры гэтым 169 ахвяр агню на момант трагедыі знаходзілася «пад мухай».

## ДРУГІ ШАНЦ НА ЖЫЦЦЁ

Праўда, некаторым аматарам пакурыць дома, а потым заснуць, шанцуе. Днямі ратавальнікам паступіла паведамленне аб узгаранні жылога дома ў аграгарадку Шашкі Стаўбцоўскага раёна. Першыя падраздзяленні МНС, якія прыбылі да месца выкліку, устанавілі, што жылы дом гарыць адкрытым полымем.

«Першапачаткова ў нас была інфармацыя, што ў хаце знаходзяцца людзі: гаспадыня і яе сын, — расказаў **старшы інструктар-ратавальнік Юрый ЯНУШЭВІЧ**. — Калі мы прыбылі да месца пажару, то ад суседзяў даведаліся, што гаспадыня самастойна змагла пакінуць дом. Унутры заставаўся яе сын. Мы правялі разведку, пасля чаго адразу ж стварылі звяно і ўвайшлі ўнутр».

У кухні на падлозе ў беспрытомным стане быў знойдзены мужчына. Выкарыстоўваючы спецыяльную маску, супрацоўнікі МНС вынеслі пацярпелага на свежае паветра і перадалі брыгадзе хуткай медыцынскай дапамогі. Выратаваны быў дастаўлены ў прыёмнае аддзяленне Стаўбцоўскай цэнтральнай раённай бальніцы. У прамым сэнсе людзі засталіся без даху над галавой. Таксама быў пашкоджаны легкавы аўтамабіль, які знаходзіўся побач з хатай. Як пасля ўстанавілі следчыя, да пажару прывяло неасцярожнае абыходжанне з агнём пры курэнні.

Па гэтай жа прычыне ўзгаранне адбылося ў Радашковічах. Калі падраздзяленні МНС прыбылі да месца выкліку, то выявілі шчыльнае задымленне ўнутры жылога дома.

«Суседзі на вуліцы паведамілі, што ў доме знаходзяцца людзі, — распавёў **начальнік дзяжурнай змены Уладзіслаў ПАЎЛОВІЧ**. — Утварыўшы звяно газадымаабаронцаў, мы ўвайшлі ў дом і ў адным з пакояў на падлозе знайшлі мужчыну. Ён знаходзіўся ў прытомнасці, але не разумеў, што адбываецца, бо быў вельмі п'яны. Мы вывелі яго на вуліцу. Потым зноў вярнуліся ў дом. Па словах мужчыны, там яшчэ знаходзілася яго жонка». У шпіталізацыі пацярпелыя не мелі патрэбы. А вось аб рамонце ў найбліжэйшы час гаспадарам варта паклапаціцца.

Ад згубнай звычкі аднаго нядобрасумленнага грамадзяніна пацярпелі жыхары шматпавярховага дома ў Мачулішчах, што пад Мінскам. Паведамленне аб узгаранні кватэры на першым паверсе двухпавярховага шматкватэрнага жылога дома ратавальнікам паступіла ноччу. Прыбыўшы да месца выкліку, супрацоўнікі МНС убачылі, што з кватэры, размешчанай на першым паверсе, ідзе дым.

Наступствы пажару, які адбыўся па віне курцоў.

«Пры пад'ездзе да дома ў акне кватэры ўбачылі мужчыну, які спрабаваў выбрацца, — згадалі ратавальнікі. — Праз акно яго дасталі. Нашы калегі адначасова вывелі з вышэй размешчаных кватэр шэсць чалавек, траіх з іх — па трохканеннай лесвіцы». На шчасце, абышлося без пацярпелых.

Як канстатуе **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Анастасія ШВАЙБОВІЧ**, практычна ўсе курцы мяркуюць, што сітуацыя знаходзіцца ў іх пад кантролем і што з імі бяда дакладна не здарыцца. «Як правіла, менавіта саманадзейнасць і становіцца прычынай пажару, — заўважае яна. — Тэмпература недакуркаў, якія тлеюць, дастатковая для ўзгарання гаручых матэрыялаў: выклікаўшы тленне, сам недакурак праз некаторы час згасае. Але ачаг тлення пры спрыяльных умовах ператвараецца ў пажар».

Прадстаўнікі ратавальнага ведамства рэкамендуюць выконваць правілы пажарнай бяспекі ў побыце, не дапускаць курэння ў жылых памяшканнях, сачыць за тым, каб запалкі і цыгарэты пасля выкарыстання былі патушаны. «Устанавіце ў жылых пакоях аўтаномныя пажарныя апавяшчальнікі, якія ў выпадку ўзнікнення пажару своечасова папярэдзяць вас аб небяспецы, — раіць Анастасія Швайбовіч. — І памятайце: адна непатушаная цыгарэта можа загубіць жыццё. І не адно! Агонь бязлітасны, беражыце сябе і сваіх блізкіх!»

## ДАЙСЦІ ДА КОЖНАГА

На жаль, па трагічныя прыклады далёка хадзіць не трэба. 20 кастрычніка пажар адбыўся ў адной са сталічных кватэр. Загінуў гаспадар 1963 года нараджэння. Праз пяць дзён няшчасны выпадак быў зафіксаваны ў Віцебску: агонь забраў жыццё мужчыны 1960 года нараджэння. Адразу да дзвюх смерцяў 18 кастрычніка прывяло ўзгаранне ў жылым доме ў Свіслачы: заўчасна з жыцця пайшлі мужчыны 1979 і 1982 гадоў нараджэння. 1 лістапада пажар успыхнуў у аграгарадку Валеўка Навагрудскага раёна, у выніку чаго загінуў мужчына 1964 года нараджэння. Усе гэтыя трагічныя выпадкі аб'ядноўвае адна прычына, па якой загінулі людзі, — неасцярожнасць пры курэнні.

З мэтай папярэджання пажараў і гібелі людзей ад іх па прычыне неасцярожнага абыходжання з агнём падчас курэння стартавала рэспубліканская інфармацыйна-прапагандысцкая кампанія «Не прапальвай сваё жыццё!». Акцыя пройдзе ў два этапы і завершыцца 28 лістапада.

Як адзначае **афіцыйны прадстаўнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Яўген БАРАНОЎСКІ**, ратавальнае ведамства пастаянна сочыць за аператыўнай абстаноўкай з пажарамі, аналізуе асноўныя рызыкі іх узнікнення. «Адпаведна праводзіцца комплекс мерапрыемстваў, накіраваных на папярэджанне пажараў у жылым фондзе, — патлумачыў ён. — З улікам высокага ўзроўню небяспекі ўзнікнення пажараў, звязаных з неасцярожным абыходжаннем з агнём падчас курэння, праводзіцца акцыя «Не прапальвай сваё жыццё!». Прафілактычныя мерапрыемствы пройдуць на прамысловых прадпрыемствах, у пунктах прыёму друсгаснай сыравіны, інтэрнатах, месцах размяшчэння аўтакрам, а таксама ў месцах масавага знаходжання людзей. Супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях правядуць інтэрактыўную гутарку з удзельнікамі акцыі і прадэманструюць фільм «Ахвяры згубнай звычкі», а таксама відэаролікі, у якіх раскажваецца пра наступствы неасцярожнага абыходжання з агнём пры курэнні».

Аб гэтым ратавальнікі нагадаюць і ў ВНУ, каледжах, ліцэях, цэнтрах бяспекі, іншых месцах з масавым знаходжаннем людзей. Для ўдзельнікаў акцыі будуць падрыхтаваны віктарыны, конкурсы мініяцюр, адкрытыя дыялогі, тэматычныя дыскатэкі, дзе кожны зможа замацаваць свае веды ў галіне бяспекі жыццядзейнасці.

У месцах з масавым знаходжаннем людзей і на адкрытых пляцоўках прапагандысты МНС правядуць «Парк бяспечных атракцыёнаў», «Шоу без цыгарэт». У гэты час усе ахвотныя змогуць адмовіцца ад курэння і памяняць цыгарэты на кашто'ўныя прызы і падарункі, а таксама зрабіць яркія фатаграфіі з роставай лялькай і на фоне тэматычных стэндаў. Будзе аб'яўлены конкурс на размяшчэнне ў інтэрнэце найлепшага відэаролікa на тэму «Я не куру ў ложку і табе не раю», у якім зможа прыняць удзел кожны.

Ратавальнікі прапануюць далучацца да мерапрыемстваў, каб перамагчы ў барацьбе са згубнай звычкай і зрабіць жыццё больш бяспечным.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота прэс-службы МНС.**

Клімат

# Кастрычнік пацяплеў

## А пераход да актыўнага холаду адбыўся на два тыдні пазней, чым звычайна

**Сярэдняя тэмпература паветра другога месяца восені ў нашай краіне склала 8 цяпла, што вышэй за кліматычную норму на 1,2 градуса. А, па падліках спецыялістаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды, кастрычнік бягучага года заняў 11-е месца ў ранжыраваным шэрагу назіранняў ад самага цёплага да самага халоднага, пачынаючы з 1945 года.**

Па большай частцы тэрыторыі краіны адзначалася дадатная анамалія тэмпературы паветра. Яна знаходзілася ў асноўным у межах ад 0,2 да 1,6 градуса. Па крайнім паўночным усходзе была адзначана нязначная адмоўная анамалія. У абласным разрэзе найбольшыя значэнні дадатных адхіленняў тэмпературы паветра ад кліматычнай нормы адзначаны ў Брэсцкай вобласці (у сярэднім па рэгіёне плюс 2 градусы), а ў Віцебскай вобласці адхіленні былі найменшымі (плюс 0,3 градуса).

Як адзначаюць кліматолагі, сярэдняя тэмпература паветра ўсіх трох дэкад была вышэйшай за норму. Так, дзённыя тэмпературы паветра большую частку месяца ў асноўным складалі плюс 11—20 градусаў, у асобныя суткі — плюс 10 — плюс 5 градусаў і ніжэй. Максімальнага значэння (плюс 25 градусаў) тэмпература паветра дасягнула днём 14 кастрычніка ў Драгічыне. Тэмпература паветра пераважна ўначы знаходзілася ў межах 6—11 цяпла, але ў асобныя суткі паніжалася да плюс 2—5 градусаў. У самыя халодныя ночы тэмпература паветра месцамі апускалася да адмоўных значэнняў. Мінімальная тэмпература паветра адзначана на станцыі Брагін 11 кастрычніка і склала мінус 5,7 градуса.

Устойлівы пераход сярэдняй сутачнай тэмпературы паветра праз 10 градусаў у бок паніжэння (заканчэнне перыяду актыўнай вегетацыі) адбыўся на 3—13 дзён пазней сваіх звычайных тэрмінаў — 6—8 кастрычніка, і толькі на крайнім поўдні і паўднёвым захадзе пераход наступіў 15—16 кастрычніка. Далейшае паніжэнне тэмпературы назіралася 19—26 кастрычніка, калі па паўночнай частцы краіны сярэдняя сутачная тэмпература паветра перайшла праз 5 градусаў, дадалі сіноптыкі.

За месяц у сярэднім па Беларусі выпала 83,3 міліметра ападкаў, што склала 153 % кліматычнай нормы. Кастрычнік 2023 года заняў 10-е месца ў ранжыраваным шэрагу назіранняў ад самага вільготнага да самага сухога. Па большай частцы тэрыторыі краіны выпала 100—200 % кліматычнай нормы ападкаў.

Больш за ўсё ападкаў кліматолагі адзначылі на тэрыторыі Гомельскай і Віцебскай абласцей — у сярэднім 96,4 міліметра і 96,2 міліметра, або 174 % і 155 % нормы адпаведна. Менш за ўсё — на тэрыторыі Брэсцкай вобласці — 59,5 міліметра, або 134 % нормы. Ападкі выпадалі ў выглядзе дажджоў, у асобныя суткі месцамі адзначалася выпадзенне снегу. Па Віцебскай, а таксама паўночнай частцы Мінскай і Магілёўскай абласцей 26—27 кастрычніка на непрацяглы час усталявалася снежнае покрыва вышынёй ад 0,1 сантыметра да 9 сантыметраў.

На працягу месяца ў асобных раёнах краіны ў начныя і ранішнія гадзіны назіраліся туманы, месцамі — галалёдныя з'явы, навальніцы і град. Адзначалася ўзмацненне хуткасці ветру парывамі да 15 м/с і больш, месцамі дасягнула крытэрыю небяспечнай гідраметэаралагічнай з'явы (25 м/с і больш). Спецыялістамі была зафіксавана максімальная хуткасць ветру за месяц на станцыі Слуцк 8 кастрычніка (28 м/с).

**Сяргей КУРКАЧ.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
9 ЛІСТАПАДА 2023 г.
ЧАЦВЕР
№ 21 (15965)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

## Аляксандра МЕЛЕХ:

# «АДПАЧЫВАЮ НА КАНЦЭРТАХ. ГЭТА ЯК І НЕ ПРАЦА ЗУСІМ»

**У сацсетках яна называе сябе народнай душой і ў гэтыя словы ўкладае ўсю сваю любоў да поп-фолку. Гэта тое, чым жыве і дыхае. «Там, дзе я, там народныя песні. 24 на 7 у мяне ў вушах гучыць толькі народны матыў. Я вялікі фанат гэтага кірунку, гэта маё жыццё», — сказала яна падчас аднаго інтэрв'ю. Спявачка ўпарта ішла да сваёй мары. Аднак шлях да поспеху не быў лёгкі. Маладая артыстка шмат працавала і грукалася ва ўсе дзверы, каб дамагчыся жаданага. Многім можа здацца, што яе характар такі ж мяккі, як і знешнія рысы, але, пагутарыўшы з творцай, разумееш: яна мае ўнутраны стрыжань і моцную прагу да творчасці. Два гады таму зорка Аляксандры Мелех заззяла на небасхіле беларускай эстрады. Хіт 2021 года «Ах, Аляксандр!» застаецца любімым трэкам многіх. Гэта не толькі першая песня, якая зрабіла Аляксандру папулярнай, але і яе першы кліп. Гэтым творам, кажа сама артыстка, аўтары Яўген Алейнік і Ганна Сялук трапілі ў самае сэрца, ну і, вядома ж, сэрцы мільёнаў беларусаў. Маладая спявачка не збіраецца стаяць на месцы і прадаўжае скараць музычны Алімп сваімі новымі, не менш гучнымі, запальнымі хітамі — «Брось слова» і «Цените настоящего мужчину». Мы сустрэліся з салісткай і пагутарылі пра шчаслівую зорку, незвычайны вобраз і яе душэўную музыку.**

***— Аляксандра, раскажы, калі ласка, ты заўсёды марыла апынуцца на сцэне і стаць спявачкай? Які шлях табе прыйшлося прайсці?***

— Калі мне было тры гадкі, бацькі тады ўжо ўбачылі, што я адчуваю сябе на сцэне як рыба ў вадзе. Заўсёды ведала, што буду спявачкай. Ніхто не забараняў спяваць, наадварот, падтрымлівалі. Я сама напрасілася ў музычную школу *(усміхаецца)*. У першым класе да нас прыйшлі набіраць дзетак на інструменты і вакал. Ніхто не падняў рукі, адна я. Мне было шэсць гадоў. Памятаю, прыйшла і кажу маме: я пайду ў музычную школу. Маці, Анжэла Міхайлаўна, працуе ў школе матэматыкам. Але яна ніколі не настойвала, каб я таксама стала ім. Бачыла, што я жыву сцэнай. Са мной было ўсё зразумела. Аднак не ўсе верылі, што шлях артысткі будзе паспяховы. Пасля скончыла Мазырскі музычны каледж па спецыяльнасці «Харавое дырыжыраванне. Акадэмічны хор», затым паступіла ва ўніверсітэт культуры і мастацтваў па спецыяльнасці «Народны хор». Падчас вучобы спявала ў заслужаным калектыве «Неруш». Трапіла ў гурт «Аўра» да Яўгена Алейніка і Юліі Быкавай. Па размеркаванні працавала педагогам у цэнтры дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Светач». Пасля адпрацоўкі засталася там яшчэ на год. І зразумела, што вельмі мала часу на дзетак. Прыйшлося выбіраць. Вырашыла, што трэба развівацца ў сольным кірунку. Сваіх вучняў я адправіла да добрых выкладчыкаў, нікога не пакрыўдзіла, усе прытулены *(усміхаецца)*. Сёлета афіцыйна стала паўнавартасным супрацоўнікам музычнай медыякампаніі, бо раней працавала па сумяшчальніцтве. Так і пачалася творчая кар'ера. Мне казалі, маўляў, куды тваё народнае! Гэта ўзровень вясковага клуба. Далей ты нікуды не трапіш і не пройдзеш. Але я стукалася ва ўсе дзверы, удзельнічала ў розных конкурсах, канцэртах. І мяне заўважылі.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Крэатыў

# ЯК «МІЛАША» ДА ПЕРАМОГІ ПРЫВЯЛА

## Чым здзіўлялі ўдзельнікі міжнароднага праекта «100 ідэй для СНД»?

**Юнакі і дзяўчаты з васьмі краін Садружнасці прынялі ўдзел у фінале міжнароднага маладзёжнага праекта «100 ідэй для СНД», які прайшоў у Мінску. Сярэдні ўзрост фіналістаў — ад 17 да 30 гадоў. Побач прэзентавалі свае ідэі як школьнікі, так і маладыя паспяховыя бізнесмены, супрацоўнікі навуковых цэнтраў краін СНД. Усяго сёлета на конкурс было прадстаўлена 45 распрацовак. Найбольшая колькасць — ад Беларусі (дванаццаць) і Расійскай Федэрацыі (дзесяць). У расійскую дэлегацыю ўвайшлі выпускнікі розных сезонаў конкурсу «Мая краіна — мая Расія».**

Фота Лізаветы ГОЛАД.

Як заўважыў **прарэктар па вучэбнай рабоце ўстановы вышэйшай адукацыі «МІРЭА — Расійскі тэхналагічны ўніверсітэт» Андрэй ЦІМАШЭНКА**, член міжнароднага журы, за апошнія чатыры гады якасць праектаў істотна ўзрасла. «Праекты узляцелі, як ракеты. Тое, што мы бачым сёння, — зусім іншыя праекты, чым тыя, што былі чатыры гады таму. Гэта ідэі для ўсёй Садружнасці. Праекты вельмі розныя: у вобласці інфармацыйных, сацыяльных тэхналогій, адукацыі, тэхнікі. І ў кожнага ёсць нейкая свая разыначка. Яны прайшлі вельмі жорсткі адбор у сваіх краінах», — канстатаваў ён.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

Рух ад сэрца

# ЗОАВАЛАНЦЁРСТВА ПРАЗ... САЦЫЯЛЬНЫЯ СЕТКІ

## Гэта найкарацейшы шлях яго папулярызацыі сярод школьнікаў

**Валанцёрскі рух сярод маладога пакалення з кожным годам набірае ўсё большую папулярнасць. Гэтыя хлопцы і дзяўчаты дапамагаюць не толькі людзям, але і нашым чатырохлапым сябрам. А некаторыя з іх яшчэ і актыўна прасоўваюць пасыл тварыць добрыя справы праз сацыяльныя сеткі. Мы пагутарылі з валанцёркай з Мінска, пераможцай конкурсу «Валанцёр года — 2022» у намінацыі «Валанцёрскі TikTok» Міленай ПЕНКАЛЬСКАЙ і даведаліся, як яна прыйшла ў гэтую сферу і як прасоўваць валанцёрскі рух праз сацыяльныя сеткі.**

— Любоў да жывёл у мяне з самага дзяцінства. Зоаваланцёрствам пачала займацца яшчэ ў школе. Калі стала студэнткай Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, уступіла там у шэрагі валанцёрскага клуба «СЛОН» і працягнула дапамагаць жывёлам. Блізкія ставяцца да маёй дзейнасці станоўча. Вядома, калі я прыношу ў дом коцікаў або сабачак, мне кажуць: «Мілена, ну ўсіх не выратуеш», «Куды нам іх?», «У нас маленькая кватэра» і таму падобнае, але ў той жа час яны разумеюць, прымаюць, дапамагаюць і любяць усіх маіх выратаваных гадаванцаў. Шчыра кажучы, потым досыць цяжка развітвацца з імі, калі знаходзім новых гаспадароў. Нават мая сям'я ўжо і сама гатовая пакінуць іх, забыўшыся пра ўсё тое, што казалі мне першапачаткова. Акрамя таго, што я сама з'яўляюся зоаваланцёрам, цяпер, працуючы педагогам-арганізатарам мінскай сярэдняй школы № 164 імя Б. В. Карпенкі, прывіваю клопат аб чатырохлапых і сваім вучням.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
9 11 2023 г.

# ЯК «МІЛАША» ДА ПЕРАМОГІ ПРЫВЯЛА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Трэба заўважыць, што Рэспубліканскі праект «100 ідэй для Беларусі» стаў візітнай карткай Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі і брэндам маладой незалежнай Беларусі. Ён стартаваў 12 гадоў таму. А затым яго падхапілі і іншыя краіны — удзельніцы СНД. Сёлетні фінал стаў ужо пятым па ліку. У 2021 годзе моладзь прымала Арменія, у 2019 годзе — Азербайджан. А першыя два сезоны фінішыравалі ў Мінску.

## ЕЎРАПЕЙСКАЯ СЫРАВАРНЯ... НА БАЙКАЛЕ

Як канстатуюць самі ўдзельнікі, самае складанае — абараніць свой праект. Для гэтага трэба валодаць аратарскім майстэрствам, умець быць пераканаўчымі, мець навыкі прасоўвання свайго брэнда ў медыяпрасторы. У кагосьці гэта атрымалася лепш, у кагосьці — горш. Натуральна, што ўсе праекты перамагчы не могуць. Але перад абаяннем і пераканаўчасцю **маладога расійскага фермера з Іркуцкай вобласці Мікіты РОСАВА** цяжка было ўтрымацца...

Яго праект «Ферма і сыраварня «Мілаша» з аўтарскай гастранамічнай праграмай» перамог у намінацыі «Гасціннасць». Мікіту Росава многія іркуцяне ведалі раней як відэааператара і прадзюсара. Па першай адукацыі ён юрыст, але ў 2018 годзе хлопец пераехаў з горада ў вёску Хамутова, стварыў ферму «Мілаша», запусціў сыраварню... Цяпер у гаспадарцы Мікіты налічваецца больш за 30 галоў коз нубійскай і альпійскай парод. Самую першую, з якой усё і пачалося, клічуць Мілаша. Менавіта яна і стала брэндам фермерскай гаспадаркі. Сёння з уласнай сыравіны і каровінага малака, якое набываецца дадаткова, індывідуальны прадпрымальнік вырабляе каля 30 відаў сыру па еўрапейскіх рэцэптурах, сярод іх «Шанкліш», «Бурата», «Гарганзэла Дольче», «Мантэрэй Джэк», «Качота», «Валансэ» і іншыя.

— Але мой праект зусім не пра сыр, — усміхаецца Мікіта. — Калі ехаў у Беларусь, мне было важна падзяліцца з іншымі краінамі СНД сваім досведам развіцця ўнутранага турызму. Мы стварылі на возеры Байкал у Сібіры еўрапейскую ферму-сыраварню. Не ўсе могуць дазволіць сабе туры ў Еўропу, а пандэмія і ўвогуле зрабіла іх немагчымымі. Я быў у Германіі ў 2019 годзе і сёе-тое там падглядзеў. На конкурсе я выступаю са сваім аб'ектам аграгурызму — дэманстрацыйнай пляцоўкай з козамі, якая дазваляе прымаць на жывёлагадоўчай ферме да 50 чалавек адначасова. Пакуль што мы практыкуем туры выхаднога дня — праграма разлічана прыкладна на 2,5 гадзіны. Кошт білетаў вельмі дэмакратычны — усяго 500 расійскіх рублёў. Гэта сума проста пакрывае сабекошт, а асноўная выручка ідзе ад рэалізаванай гасцям прадукацыі. Людзі частуюцца нашымі сырамі на месцы і жадаюць прыхапіць іх з сабой. Цікавяцца, дзе ў Іркуцку можна іх набыць. Атрымліваецца сарафаннае радыё. З горада да нас можна дабрацца за 30 хвілін. Ніякіх грошай у сваю раскрутку мы не ўкладаем. Рэпутацыя ствараецца яшчэ і за кошт рэалізацыі сацыяльных праектаў. Напрыклад, у маі мы арганізавалі дзесяць бясплатных гастранамічных праграм з ветэранамі працы, дзецьмі вайны і валанцёрамі Перамогі. Да нас прыязджае аўтобус з Дома ветэранаў, я на вачах ва ўсіх гатую, да мяне далучаецца ветэран і пры гэтым ён паралельна дзеліцца цікавымі жыццёвымі гісторыямі.

Пачалі эксперыментаваць і з групамі кітайскіх турыстаў. Перакладчык звычайна імкнецца максімальна спрасціць тое, што расказвае экскурсавод, і змест інфармацыі, што транслюецца, часта атрымліваецца малапрывабным. Таму я сам праводжу экскурсіі на англійскай мове, якой добра валодаю. І высвятляецца, што гасцям цікавыя ўсе нюансы і падрабязнасці. Яны задаюць мне шмат пытанняў.

У Беларусь я спецыяльна прыехаў за некалькі дзён да конкурсу, хацеў наведаць вашы аб'екты аграэкатурызму, але высветлілася, што яны працуюць толькі ў выхадныя дні. Вельмі шкада...

Мы валодаем абмежаваным запасам зямлі, але наступным летам пачынаем будаваць дэманстрацыйны ангар з жывёламі, каб прыцягнуць яшчэ большую колькасць турыстаў. Ангар будзе падзелелены на кантактную зону з козамі і дэгустацыйную залу з летняй тэрасай. Людзі змогуць пры жаданні і даенне жывёл асвоіць (для гэтага будуць устаноўлены трэнажоры), і адпачыць, і пераку сіць. З укараненнем асобнай праграмы «Дзень фермера» будзем прымаць гасцей сем дзён у тыдзень і ў любы сезон, бо ангар будзе ўцеплены. Працягласць экскурсіі можна скараціць да 30—60 хвілін, бо не ва ўсіх багата вольнага часу. За кошт прыёму груп турыстаў у буднія дні зможам адбіваць выдаткі на персанал, а выручка ў выхадныя дні будзе накіроўвацца на набыццё сыравіны, прыбытак і развіццё гаспадаркі. Лічу, што гэта ключ да далейшага развіцця сельскіх тэрыторый у плане аграгурызму — прымаць гасцей ва ўсе дні тыдня. Агульны кошт праекта — 13 мільёнаў 400 тысяч расійскіх рублёў. Ён павінен акупіцца праз 34 месяцы. Мы ўжо знайшлі фінансаванне...

Мікіта прызнаўся, што ўдзел у міжнародным праекце «100 ідэй для СНД» выклікаў у яго вялікую прафесійную цікавасць: «Для мяне гонар быць тут. І я хачу даць зваротную сувязь. Захацелася падзяліцца сваімі ідэямі і знайсці аднадумцаў. Мне ўдалося знайсці калег у маёй справе як на пляцоўцы праекта, так і за яго межамі, у Мінску. У Іркуцкую вобласць, акрамя перамогі, я прывязу і новыя ідэі...»

## СТВАРАЕМ КАЗКУ РАЗАМ

**Яўгенія КОТАВА з Масквы** прадстаўляла ў фінале мабільную праграму «Сказаўрыя».

— Наш праект — гэта не стандартная казкатэрапія. «Сказаўрыя» — канструктар павучальных казак, генератар гісторый, у якім дзіця можа стварыць сваю ўнікальную жывую казку. Чароўны свет складаецца з розных модуляў, якія можна выбіраць і складваць. Бацькам часта даводзіцца прыдумляць і расказваць сваім дзецям казкі на ноч. А мы спрасцілі іх задачу. Вы выбіраеце героя, лакацыю і сочыце за сюжэтам. Дарэчы, на яго можна ўплываць — для гэтага ёсць развілкі ў сюжэце. Дзіця само вырашае, як паступіць персанажу, у залежнасці ад гэтага мяняецца і фінал гісторыі. Малое можа ўбачыць, да чаго прывялі яго дзеянні, так яно вучыцца выбудоўваць лагічныя ланцужкі і не паўтараць негатыўны вопыт у будучыні. У нас сабрана ўжо больш як 125 аўтарскіх казак, дадатак запушчаны, яго можна спампаваць. Усе казкі праверaны псіхолагамі. Мы ўздымаем такія тэмы, якія бацькам цяжка растлумачыць самастойна, нават тэму страты родных. Мы імкнемся дапамагчы ім выхаваць упэўненых у сабе дзяцей, з карысцю правесці вольны час і ўмацаваць узаемаадносіны. Дарослыя павінны зразумець, што дзеці — самастойныя асобы, якія могуць рабіць выбар, праяўляць эмоцыі і выказваць сваё меркаванне. Галоўнае гэта ўсё не душыць, а падтрымліваць, тлумачыць і накіроўваць. Наш праект аб развіцці эмацыйнага інтэлекту, аб крытычным мысленні і аб тым, як вырасці Чалавекам. Мы даем магчымасць не проста спажываць кантэнт, а задзейнічаць свае сілы ў яго стварэнні.

Акрамя магчымасці мяняць ход гісторый, у «Сказаўрыі» да кожнай аўтарскай казкі ёсць пытанні, якія варта задаць малому пасля прачытання. Так бацькі дапамагаюць дзіцяці развіць памяць, палепшыць разуменне прачытанага, і, дзякуючы абмеркаванню, наладжваюць з ім кантакт.

## ПРАЗ ПРЫЗМУ СЯМЕЙНЫХ ФАТАГРАФІЙ

**Анастасія СУРАЎНЕВА, педагог-арганізатар маскоўскага Цэнтра развіцця творчасці дзяцей і юнацтва «Гермес»**, прывезла ў Мінск праект «Гісторыя адной фатаграфіі».

— Мы прапануем ажывіць гісторыю з дапамогай старых фотаздымкаў. Ва ўсіх сем'ях захаваліся старыя фотаальбомы, але мы далёка не заўсёды ведаем, хто паглядае на нас з пажаўцелай фотакарткі, — кажа Анастасія. — Дык давайце зазірнём у гісторыю сям'і, распытаем самых старэйшых яе членаў. Мы ўжо неаднойчы пераканаліся, што часам здараюцца вельмі нечаканыя сямейныя адкрыцці. Да таго ж і дыялог пакаленняў адбываецца...

У нашым праекце мы маем намер узнавіць эпоху праз прызму старых сямейных фатаграфій. Даць магчымасць удзельнікам паказаць астатнім, як жылі члены яго сям'і, яго далёкія і блізкія сваякі. Магчыма, на старых кадрах — дзіўныя і дагэтуль невядомыя моманты, якія ў далейшым паўплывалі на жыццё людзей, напрыклад, развіццё якога-небудзь раёна або вуліцы, або ўсяго горада. Наш праект — не проста збор архіва, а спосаб стварыць інтэрактыўны альманах, дзе будуць прадстаўлены розныя часавыя этапы жыцця з анатацыяй да кожнай фатаграфіі, якая дапаможа распавесці ўнікальную гісторыю сям'і, узнавіць тую ці іншую гістарычную падзею.

Асабліва вітаюцца здымкі пачатку XX стагоддзя, часоў Вялікай Айчыннай вайны, праведзеных гадоў. Трэба выбраць фатаграфію, адсканаваць яе і напісаць эсэ да абранай фатаграфіі. Многія ўнікальныя фатаграфіі атрымліваюць другі шанц, бо фотапапера мае свой тэрмін, яна недаўгавечная. Штогадовы вынік праекта — вялікая фотавыстава сезона і выпуск альманаха гісторый. Нашы фотаэкспазіцыі вандруюць па ўстановах культуры і буйных сталічных пляцоўках.

## ШТУЧНЫ ІНТЭЛЕКТ — НА СЛУЖБЕ Ў МЕДЫЦЫНЫ

**Мірабас БАГІРАЎ, кіраўнік рэгіянальнага навукова-адукацыйнага цэнтра «Штучны інтэлект і аналіз Вялікіх даных. Школа хакатоншчыкаў» Ніжагародскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта**, абараняў у фінале «100 ідэй для СНД» праект «Паліклініка будучыні».

— Наша каманда распрацавала інтэлектуальную сістэму дапамогі ўрачам з модулем лекавага ўзаемадзеяння для эканоміі працоўнага часу. Яна дазваляе выключыць першасны візіт пацыента ў паліклініку пры дапамозе агульнасаматычнага прафіляванага анкетавання, запісу на неабходныя аналізы і абследаванні перад прыёмам спецыяліста, а таксама праверыць узаемадзеянне лекавых прэпаратаў пры іх прызначэнні і тым самым мінімізаваць рызыку з'яўлення пабочных эфектаў. Многія фактары ўрачамі не бяруцца пад увагу пры прызначэнні таго ці іншага лякарства, а сістэма ўлічвае індывідуальныя асаблівасці пацыента, усе лекі, што ён ужо прымае, інструкцыю па прымяненні канкрэтнага прэпарата, як можа ўплываць яго дзеючае рэчыва на розныя органы, і выдае ў якасці святлафора, што пацыенту можна, а што нельга з лекаў ужываць. Мы скарачаем час на візіт пацыента і адпаведна чэргі ў паліклініках. У двух установах аховы здароўя, дзе ўжо ўкаранёная наша сістэма, час знаходжання пацыентаў ва ўрача скараціўся амаль утрая пры выпісцы лекавых прэпаратаў. А ў медыцынскіх ВНУ наша сістэма на прыкладзе сітуацыйных задач дапамагае студэнтам разбіраць розныя выпадкі і на іх вучыцца. Таксама дзякуючы штучнаму інтэлекту мы аналізуем шмат дадзеных, ацэньваем узаемадзеянне прэпаратаў, выяўляем спецыфічныя захворванні для канкрэтнага рэгіёна.

Сістэма рэалізавана ў выглядзе вэб-сэрвісу з доступам з любой прылады. Ёсць магчымасць пашырэння функцыяналу і дадання новых інавацыйных модуляў.

У намінацыі «Медыцына і ахова здароўя» першае месца заваяваў **праект з Азербайджана «ABC (Amyotrophic Brain Cube)» — інвалідная каляска з кіраваннем галавой для людзей з паралічам, якую стварылі Фарыд Шыхіеў, Руфат Шыхіеў і Мурад Самедаў.**

— Для гэтага на галаву мацуецца спецыяльная прылада, якая рэагуе на яе рухі, — тлумачыць Руфат Шыхіеў. — Таксама ёсць датчыкі, якія рэагуюць на сэрцабіцце і іншыя жыццёва важныя паказчыкі: пры іх пагаршэнні сігнал трывогі тут жа падаецца блізкім.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

**Цалкам матэрыял чытайце на zviazda.by**

*У ліку найлепшых*

# ВЫБРАЛІ «СТУДЭНТА ГОДА СТАЛІЦЫ»

**У Палацы культуры чыгуначнікаў адбыўся грандыёзны фінал Мінскага гарадскога этапу рэспубліканскага конкурсу «Студэнт года». Свае ўстановы вышэйшай адукацыі прадставілі і пазмагаліся за выхад у фінал 12 пераможцаў адборачных тураў.**

Фота БелТА.

У гэтым годзе канцэпцыяй гарадскога тура конкурсу «Студэнт года» сталі «Эксклюзіўныя авіялініі». Удзельнікаў чакала насычаная праграма: творчыя нумары, дэманстрацыя прамоўніцкага майстэрства па зададзеных тэмах. Інтэлектуальны тур (абарона праектаў) прайшоў напярэдадні фіналу.

Варта адзначыць, што на працягу двух тыдняў канкурсанты прайшлі сапраўдны творчы марафон: майстар-класы на згуртаванне, па дэфіле ад «Міс Мінск — 2023» Надзеі Толсцікавай, курсы па прамоўніцкім майстэрстве ад тэлевядучага Жана Сянкевіча, лекцыі аб асабістым брэндзе і правільнай абароне праекта ад дырэктара «Белбрэндаўдыт» Валянціны Дыніч, рэпетыцыі, прымеркі і падбор калекцый.

Пераможцай гарадскога этапа конкурсу «Студэнт года» стала студэнтка Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Юлія Левіна. Яна падзякавала арганізатарам конкурсу і сваёй камандзе, а таксама адзначыла, што падрыхтоўка была вельмі складанай, але ўсе намаганні поўнасцю апраўдаліся. Цяпер дзяўчына прадставіць Мінск на рэспубліканскім этапе конкурсу. Другое месца заняў студэнт Міжнароднага ўніверсітэта «МІТСО» Іван Осіпаў, а трэцяе падзялілі паміж сабой студэнтка БДУ Стэфанія-Віталія Віннічак і студэнтка БНТУ Арына Колесава.

Галоўная задача конкурсу «Студэнт года» — аб'яднаць моладзь, бо падчас адборачных тураў юнакі і дзяўчаты знаёмяцца адзін з адным і ствараюць сумесныя праекты. Аб гэтым сказаў першы сакратар Мінскай гарадской арганізацыі БРСМ Раман Бандарук: «Мы спадзяёмся, што з кожным годам усё больш студэнтаў будзе даведвацца аб гэтым конкурсе і пачне прадстаўляць сваю ўстанову адукацыі». На яго думку, інтэлектуальныя і творчыя маладыя людзі, якія ўдзельнічаюць у конкурсе, з'яўляюцца гонарам сваіх навучальных устаноў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Незвычайны інтарэс*

# АСАБЛІВАЯ ФАЎНА,

## або Экзотыка ў кватэры

**Якія хатнія жывёлы самыя распаўсюджаныя? Сабакі і каты. А наша суразмоўніца мінчанка Ганна КАЗАКОВА вырашыла спыніцца на кімсьці больш экзатычным. Дома ў дзяўчыны пабывала шмат такіх гадаванцаў — ад павукоў да крабаў.**

Па словах Ганны, да чацвёртага класа яна мела толькі тэарэтычную базу пра жывёл: шмат чытала, глядзела канал Animal Planet. Больш за ўсё ёй падабаліся перадачы, у якіх распавядалася пра яшчарак, павукоў і змей.

— Менавіта тады ў мяне з'явіўся першы гадаванец — слімак Ахаціна Фуліка. Яго бясплатна аддавалі, і я вырашыла ўзяць. Потым дома сталі з'яўляцца і іншыя віды, сярод іх былі досыць дарагія. Прыгожых малюскаў мне прывозілі нават з Масквы. Праз час цікавасць да іх знікла, — расказвае Ганна.

Наступным пасля слімакоў хатнім гадаванцам стаў павук-птушкаед.



— Усё здарылася цікавым чынам. Яго разыгрывалі ў сеціве ў групе экзатычных жывёл Мінска. Для таго каб стаць удзельнікам розыгрышу, трэба было зрабіць рэпост публікацыі. Я вельмі хацела гэтага павука, таму папрасіла сваіх сяброў таксама прыняць удзел у конкурсе, каб павялічыць шанцы на перамогу. Так і атрымалася — птушкаед стаў маім. Пасля першага павука я пачала заводзіць новых. У нейкі перыяд часу іх у мяне жыло каля дзесяці.

Суразмоўніца паведаміла, што часцей за ўсё купляе сваіх гадаванцаў на вялікай выставе-продажы экзатычных жывёл, якая праходзіць у Маскве. Аднойчы нават прывезла адтуль скарпіёна. Але мама дзяўчыны была катэгарычна супраць, з-за чаго прыйшлося прадаць гэтага незвычайнага гадаванца.

У 15 гадоў у дзяўчыны з'явілася змяя. Пра яе Ганна распавяла цікавую гісторыю.

— Яна прыбыла таксама з Масквы, і трэба было з'ездзіць на вакзал, каб забраць яе. З-за занятказ у школе ў мяне не было такой магчымасці, таму туды накіраваўся тата. Калі ён прывёз змяю дадому, вырашыў, што ёй, магчыма, не хапае паветра. Тады ён трохі прыадчыніў адну са скрынак, у якіх сядзеў мой новы гадаванец, і той змог выбрацца. Паколькі змяя была невялікага памеру, то магла схавацца абсалютна ўсюды. Каб яе знайсці, нам давялося перасоўваць усю мэблю ў доме. У выніку высветлілася, што змяя хавалася за шафай.

Жывёлы Ганны перыядычна збягаюць са сваіх тэрарыумаў. Аднойчы гэта змог зрабіць самы вялікі павук. На пошукі гадаванца сышло некалькі дзён, але ўсё было беспаспяхова.

— Яго знайшла выпадкова мама: неяк раз яна адкрыла шафу, дастала адтуль сваю сукенку, а на ёй сядзеў мой павук.

Суразмоўніца расказала, што каліські хацела сабе мадагаскарскіх тараканаў, але — як і ў выпадку са скарпіёнам — мама дзяўчыны была катэгарычна супраць. Аднак Ганна ўсё роўна купіла іх і непрыкметна прынесла дадому. І вось адбылася такая ж гісторыя, як з павуком: тараканы змаглі выбрацца з тэрарыума. Аднаго дзяўчыне ўдалося знайсці, другі ж знік у невядомым напрамку. Аднойчы раніцай па гучным крыку мамы Ганна зразумела: знайшоўся і другі таракан.

Па словах дзяўчыны, даглядаць усіх гадаванцаў нескладана.

— Галоўнае — стварыць добрыя ўмовы для жыцця, набыць кальцый і вітаміны. Спачатку закупка ўсяго патрэбнага абыдзецца нятанна. Таксама варта выконваць пэўныя правілы іх утрымання.

Цяжкімі суразмоўніца называе сітуацыі, калі жывая істота хварэе, але дапамагчы ёй няма магчымасці, паколькі гаворка ідзе пра генетычнае захворванне.

Раней сярод гадаванцаў Ганны былі таксама крабы, палачнікі і багамол. На момант гутаркі ў дзяўчыны жылі сабака, жаба і дзве яшчаркі.

— Да экзатычных жывёл у мяне навуковы інтарэс. Да іх няма такой прыхільнасці, якая, напрыклад, ёсць да сабакі, — тлумачыць суразмоўніца.

**Лізавета МАЛЬЧУК.**
**Фота дадзены гераіняй.**

# ЗОАВАЛАНЦЁРСТВА ПРАЗ... САЦЫЯЛЬНЫЯ СЕТКІ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

Дарэчы, аб конкурсе «Валанцёр года» наша гераіня даведалася і прыняла рашэнне паўдзельнічаць менавіта на рабоце. У пачатку навучальнага года ў школу прыйшло палажэнне аб конкурсе, і Мілена зразумела, што гэта яе шанц праявіць сябе. Тым больш незадоўга да гэтага ў яе жыцці здарылася вельмі цяжкая і кранальная гісторыя выратавання сямейкі чыхуахуа ад нядобрасумленнай заводчыцы.

— У канцы жніўня са мной звязалася суседка, пацікавілася, як знайсці ператрымку сабакам, якіх заводчык утрымліваў у жудасных умовах. Каб уладкаваць сям'ю чыхуашкаў, патрэбны былі фота, і я адправілася па месцы іх жыхарства. Ад выгляду пакутлівых жывёл сэрца аблівалася крывёй. Зразумела, што пакінуць іх тут не магу, і забрала да сябе. У той жа дзень наведалі ветэрынара — аказалася, адна асобіна чыхуахуа чакала патомства. Праз пару тыдняў пасля пераезду з'явіліся пяць здаровых шчанюкоў, кожнаму з якіх знайшлі любячую сям'ю. Уладкавалі і двух дарослых сабак, а маці пакінула сабе. Цяпер дома ў мяне міні-звярынец: сабакі Эмілі і Рашэль, кот Данік і трус Рубі.

Першапачаткова Мілена падавала заяўкі на ўдзел у дзвюх намінацыях конкурсу: «Асабісты ўклад» і «Валанцёрскі TikTok», і якраз другая намінацыя прынесла дзяўчыне перамогу. Як прызнаецца сама гераіня, раней яна была дастаткова далёкая ад гэтай сацыяльнай сеткі, а цяпер на яе акаўнт падпісана больш за сем тысяч падпісчыкаў, а відэа, на якіх малады педагог апісвае гісторыю выратавання трох чыхуахуа, у агульнай складанасці сабралі каля паўтара мільёна праглядаў.

— Падрыхтоўка да конкурсу праходзіла доўга. Стварыла і пачала развіваць свой акаўнт, толькі калі вырашыла паўдзельнічаць у конкурсе. Да гэтага я рабіла падобныя публікацыі толькі ў свой асабісты акаўнт у «Інстаграме». За гэты адносна кароткі перыяд мой TikTok «стрэліў», відэа сталі набіраць сотні тысяч праглядаў, адно відэа «заляцела» на паўтара мільёна, і пачала актыўна прыходзіць аўдыторыя. Тады я зразумела, што ўсё раблю не дарма і іду ў патрэбным напрамку. Прадумвала ўсё да дробязяў. Распісвала кожную ідэю. Дапамагалі ў рэалізацыі маіх задумак блізкія, малады чалавек і сяброўка. Арганізавалі хатнія фотасесіі, здымкі відэазізітоўкі, распісвалі ідэю для TikTok і маніторылі, што карыстаецца попытам. Падчас падрыхтоўкі да конкурсу лёс склаўся нават так, што на вуліцы мой малады чалавек сустрэў вядомых беларускіх ціктокераў, якія здымаюць забаўляльны кантэнт і маюць вялікую аўдыторыю. Ён паказаў мой акаўнт, яны падтрымалі мяне, далі парады, сказалі не спыняцца, а ісці далей, развівацца ў гэтым кірунку. Гэта стала для мяне дадатковай матывацыяй.

Конкурс традыцыйна праводзіўся ў тры туры: раённы, абласны і рэспубліканскі. За перамогу ў рэспубліканскім фінале змагаліся пяцьдзясят тры намінанты, і праходзіў ён у завочным фармаце. Таму наша гераіня, даслаўшы сваю заяўку, з трапятаннем чакала вынікаў. Пасля іх абвяшчэння Мілена яшчэ доўга не магла паверыць у сваю перамогу.

— Я вельмі рада, што магу насіць ганаровае званне «Валанцёр года» яшчэ і ў такой, здавалася б, нязвыклай для мяне, але вельмі важнай у рэаліях сучаснага грамадства намінацыі. Бо сацыяльныя сеткі — гэта найкарацейшы шлях укаранення валанцёрскага руху сярод школьнікаў. Валанцёрскую дзейнасць важна распаўсюджваць сярод іх хаця б для таго, каб пашырыць кругагляд навучэнцаў, выхоўваць у іх гуманнасць, адказнасць, неабыякавасць. Многія нават не здагадваюцца, што могуць унесці свой уклад і дапамагчы камусьці. Асабіста ў маім педагагічным вопыце ёсць прыклады, калі дзіця кажа: «Я не магу дапамагаць жывёлам, таму што мне бацькі не дазваляюць завесці гадаванца». У той момант я пачынаю тлумачыць, што дапамога жывёлам заключаецца не ў тым, што ты абавязкова павінен кагосьці забраць. Дапамагчы ім можна рознымі спосабамі: пакарміўшы бяздомнага ката каля пад'езда, папаўняючы кармушкі для птушак, распаўсюджваючы інфармацыю аб пошуку дома для кошкі або сабачкі ў сацыяльных сетках і гэтак далей. Галоўнае — жадаць не. І тады дзіця ўсведамляе, што яно таксама можа зрабіць добрую справу па сваіх сілах і магчымасцях. Калі я праводжу акцыі па зборы дапамогі для бяздомных жывёл, заўсёды кажу фразу: «Нават адзін пакуначак корму можа зберагчы кагосьці ад галоднай смерці». Што да мяне, то я адназначна хачу звязаць сваё жыццё з гэтай справай і развівацца ў гэтай сферы. Хачу прайсці курсы грумера і кінолага. Цяпер чытаю шмат літаратуры па дадзенай тэме. У марах стаіць мэта адкрыць зоагасцініцу або прытулак для бяздомных жывёл.

**Ангеліна НОВІКАВА.**
**Фота дадзены гераіняй.**

ПЛЕЯДА МАЛАДЫХ

# «ХАЧУ БЫЦЬ ГОДНЫМ КІРАЎНІКОМ...»

## Запаветная мара маладога кіраўніка аграгаспадаркі

## ААТ «Урэчанскі» ў Слаўгарадскім раёне Уладзіслава АДАМЧАНКІ

**ГАСПАДАРКА, якой кіруе 27-гадовы дырэктар, невялікая. Але гэта не значыць, што работы і адказнасці тут менш. Малады кіраўнік ледзь знайшоў для нас вольную гадзіну ў сваім шчыльным працоўным графіку. Прычым позна вечарам у нядзелю, калі на вуліцы ўжо сцямнела. Для сельскай гаспадаркі выхадныя дні — паняцце ўмоўнае. Восеньскіх спраў тут колькі заўгодна. Уладзіслаў удакладняе: ставілі жывёлу на зімова-стойлавы перыяд, вырашалі нюансы па даільным абсталяванні, чыстцы хлявоў, расстаноўцы жывёлы, сартаванні — пытанняў шмат.**

### СПРАВЫ СЯМЕЙНЫЯ, НЕ МЕНШ ВАЖНЫЯ

На сустрэчу малады чалавек прыехаў не адзін, а з будучай жонкай Людмілай, якую прыхапіў па дарозе з работы. Таму і размову пачалі са спраў сямейных, не менш важных, чым вытворчыя. Гэты кірунак у нашай краіне таксама ў прыярытэце.

Уладзіслаў не па гадах мудры і разважлівы. «Вы таксама заўважылі?» — пацікавілася Людміла, калі я падзяліўся сваімі назіраннямі ўслых. Ёсць такая катэгорыя маладых людзей, якія да любой справы падыходзяць з адказнасцю. Дзяўчына гэта ацаніла.

Яна хоць і магілёўчанка, але абяцае падумаць наконт таго, пераманьваць будучага сужэнца ў горад або не. Уладзіслаў сціпла маўчыць, але прызнаецца, што часу на сям'ю сапраўды няшмат.

— Ён ёсць, але не заўсёды так бывае, што свабодныя субота і нядзеля. Зімой яго больш, вядома. Але і ў зімовы час узнікаюць экстранныя пытанні. І тады трэба свае асабістыя планы адкласці, ехаць на работу... Планую хутка пайсці ў водпуск. Сілас мы нарыхтавалі, тэхніку на зімоўку амаль паставілі, практычна ўсё зрабілі. Застанецца толькі даіць кароў, карміць і чысціць у іх. Таму і планую водпуск. Па кантракце маю права на 37 дзён, але хоць бы некалькі тыдняў адпачыць. У гаспадарцы ёсць спецыялісты, у якіх можна быць упэўненым: галоўныя інжынер, аграном, ветурач. Водпуск буду праводзіць з сям'ёй, ніякіх цёплых краёў не плануем, спецыфіка работы не дазваляе.

Цікава, што Уладзіслаў — работнік сельскай гаспадаркі ў першым пакаленні. Ніхто з яго радні да гэтай галіны не мае дачынення.

— Нарадзіўся ў Слаўгарадзе, выхаваннем мяне, брата і сястры займалася маці, — расказвае ён пра сябе. — Здароўе ў маці не вельмі добрае. Гэта таксама стала адной з прычын майго вяртання на радзіму. Слаўгарадскі раён — сельскагаспадарчы, але мы жылі ў кватэры, і што гэта такое, да пары да часу ведаў апасродкавана. Але лёс склаўся так, што сельская гаспадарка стала справай жыцця. Пасля 9 класа паехаў вучыцца ў Клімавіцкі аграрны каледж па спецыяльнасці «Ветэрынарны фельчар». Па размеркаванні трапіў у Горацкую райагрампрамтэхніку, адкуль праз тры месяцы пайшоў у армію. Служыў у Бабруйску ў вайсковай часці 5527, быў наменскім камандзіра ўзвода. Нашымі абавязкамі былі забяспечваць парадак на футбольных матчах, ахоўваць горад. Даводзілася і хуліганаў затрымліваць.

Пасля арміі вярнуўся ў Горкі. Пакуль адсутнічаў, наменскі дырэктара па жывёлагадоўлі райагрампрамтэхнікі Міхаіл Сідарэнка стаў кіраўніком «Копцеўскай нівы», запрасіў мяне працаваць галоўным ветурачом. І я пагадзіўся. Падчас работы там вырашыў, што трэба павышаць кваліфікацыю, паступіў завочна на спецыяльнасць «Заатэхнікінер» у Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. Пэўны час пасля акадэміі працаваў індывідуальным прадпрымальнікам, практыкаваў артадэфычныя паслугі для жывёл. Ездзіў па ўсёй Беларусі. Жыў у Горках, а выязджаў і ў Мінск, і ў Брэст, і па ўсёй Магілёўскай вобласці.

### «ПРЫМНОЖЫЛІ СВАЕ ПАКАЗЧЫКІ, І ГЭТА РАДУЕ»

Кіруе ААТ «Урэчанскі» Уладзіслаў няпоўны год — з 2 снежня мінулага года. Цэнтр гаспадаркі знаходзіцца за шэсць кіламетраў ад Слаўгарада — у вёсцы Чырвоны Усход. Там жа ферма па адкорме быкоў, мехдвор і кантора. У суседніх Шалашах функцыянуюць малочнатаварная ферма і комплекс, а ва Урэчны — ферма для буйной рагатай жывёлы і па дарошчванні цёлак. Гаспадарка спецыялізуецца на жывёлагадоўлі. Агульнае пагалоўе складае 2164 галавы, з якіх 967 — дойныя каровы. Астатнія — рамонтны маладняк і «адкорм». У гаспадарцы працуюць 95 чалавек.

— Па выніках дзевяці месяцаў маем 120 працэнтаў эфектыўнасці работы па жывёлагадоўлі, па аграноміі — 106 працэнтаў, — канстатуе суразмоўнік. — Прымножылі свае паказчыкі, і гэта радуе. Сярэдняя зарплата ў работніка 1367 рублёў. З транспартам нам дапамагаюць, бо тут чарнобыльская зона. Раз на год нешта з новай тэхнікі даюць, забяспечваюць мінеральнымі і азотнымі ўгнаеннямі. Мы «сераднякі», хоць праблем хапае. Цяжка, напрыклад, знайсці замену нашым даяркам. Амаль усе яны перадпенсіённага ўзросту. Дзе шукаць новых, не ведаю. Ферма, на жаль, пакуль не аўтаматызаваная.

Малады дырэктар марыць адрамантаваць стары комплекс і ўстанавіць там новую сучасную сістэму даення, каб быў замкнёны цыкл — усё, пачынаючы ад нараджэння цяляці да атрымання малака, адбывалася на адной тэрыторыі. Самастойна зрабіць гэта, вядома, немагчыма. Таму звяртаецца да кіраўніцтва раёна з прапановай дапамагчы. Паралельна займаецца рэканструяваннем хлявоў, якія не выкарыстоўваюцца.

Сярэдні ўзрост працаўнікоў у калектыве 45—50 гадоў. Моладзь не вельмі ахвотна звязвае свой лёс з сельскай гаспадаркай. У Слаўгарадзе ёсць ліцэй, дзе рыхтуюць трактарыстаў, але нават мэтавікі не спяшаюцца прыходзіць адпрацоўваць. Малады кіраўнік разам са старшынёй Слаўгарадскага райвыканкама наведваў у пошуках кадраў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. Выпускнікоў бянтэжыць, што раён вельмі маленькі, усяго каля 10 тысяч чалавек. Ім больш падабаюцца вялікія гарады.

— Тая моладзь, якая працуе, таксама не заўсёды адказная, — кажа суразмоўнік. — Трэба ўвесь час кагосьці падштурхоўваць. Не ведаюць дакладна тэхналогію работы, дзесьці шкодзіць лянота. Наогул цяпер такая тэндэнцыя, што людзі адмаўляюцца ад тых жа кароў, іншай хатняй жывёлы. Раней у вёсцы ў кожнага была рагуля, а сёння — дзве-тры на вёску. Шмат хто з'язджае ў горад са словамі, што нават высокая зарплата іх не прымусіць застацца ў вёсцы. Напэўна, гэта звязана з праславутымі TikTok, «Інстаграмам» і іншымі сацсеткамі, дзе сёння ўсе сядзяць і чытаюць, што грошы прыходзяць лёгка. Вось моладзь і шукае такія варыянты. Але былі выпадкі, калі некаторыя вярталіся ў гаспадарку.

Работа Уладзіславу ў цэлым падабаецца, ёсць у ёй свае плюсы. «Кожны дзень чамусьці вучышся, спазнаеш, вывучаеш псіхалогію чалавека, — рэзюмуе ён. — Да аднаго патрэбны адзін падыход, да другога — іншы. Глядзіш, як моладзь працуе. Работа кіраўніка вельмі дапамагае развівацца, з'яўляецца разумненне таго, як працаваць з чалавекам, эканоміку пралічваць».

### ЗАМЕЖНЫ ВОПЫТ ПАЙШОЎ НА КАРЫСЦЬ

Калі Уладзіслаў працаваў галоўным ветурачом у «Копцеўскай ніве» ў Горках, пабываў разам з іншымі спецыялістамі ў двухтыднёвай замежнай камандзіроўцы. У Польшчы глядзелі, як функцыянуе жывёлагадоўчы комплекс у фермера. Было цікава даведацца, як ён абыходзіцца з вялікай гаспадаркай без вузкіх спецыялістаў. Паслугамі таго ж ветурача карыстаўся выключна па неабходнасці. Задавольваўся разавай кансультацыяй, а ўсё неабходнае рабіў сам. У Германіі беларускія спецыялісты азнаёміліся з работай лабараторыі, якая кантралюе якасць малака. Там расказалі, што для таго, каб павысіць яе да ўзроўню «экстра», ім спатрэбілася дзесяць гадоў. А ў Чэхіі атрымалася наведаць ВНУ накшталт Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі. Там іншыя падыходы да навучання будучых спецыялістаў. Першыя два курсы яны вывучаюць агульныя прадметы, а потым бяруць вузкі кірунак.

— Такога, каб заатэхнік і з кармамі працаваў, і сартаваннем жывёлы займаўся, і шмат чаго іншага рабіў, у іх няма, — кажа Уладзіслаў. — У нас жа выпускаюць універсальных спецыялістаў. Мы і пра пчол павінны ведаць, і пра свіней, і пра каро. Асабіста я вышэйшую адукацыю атрымліваў, каб глыбей разумець, як з каровамі працаваць, як іх карміць, утрымліваць. Па першай адукацыі я ветэрынар, але хутка зразумеў, што, каб у ветэрынара было менш работы, трэба добра працаваць заатэхнікі. Накарміў якасна, падаслаў, стварыў у памяшканні аптымальны мікраклімат, тады і ветурач будзе толькі прафілактыкай займацца, а не лячэннем.

«Пасля паездкі шмат чаго карыснага для сябе вынес, — прызнаецца суразмоўнік. — Па той жа арганізацыі працы. Калі вярнуўся, веды прымяніў у «Копцеўскай ніве». Па-новаму пабудаваў работу па ўтрымманні цялят да трох месяцаў. Пачалі прымяняць індывідуальныя домікі, якім раней не ўдзялялі патрэбнай увагі. Бо на свае вочы бачыў вынікі. Цяляты добра ў вазе прыбаўляюць, і прасцей працаваць у плане ўсялякіх там вакцынацый і профілактычных мерапрыемстваў. Менш страўнікава-кішачных захворванняў, хвароб органаў дыхання».

— Наша работа дынамічная, патрабуе «зверкі гадзіннікаў», — заўважае кіраўнік гаспадаркі. — Ды і цікава даведацца, як працуюць гаспадаркі ў іншых абласцях. Мой таварыш па Клімавіцкім каледжы працуе ў Гомельскай вобласці, мы з ім перазвоньваемся, расказваем адзін аднаму пра рабочыя моманты. Абмяркоўваем пераход ад звычайнай фермы да комплексу, ёсць праблемы з кваліфікаванымі кадрамі, мінімізацыю страт.

### ЯК ГЭТА — БЫЦЬ СЕЛЬГАСПРАБОТНІКАМ?

Сёлета ў калгасе эксперыментавалі, бралі летам вучняў на дапамогу. Заключылі са школамі дагаворы і запрасілі дзяцей паглядзець, як гэта — быць сельскагаспадарчым работнікам.

— Старшакласнікі вельмі захапляліся маленькімі цяляткамі, магчыма, нехта зацікавіцца і прыйдзе да нас працаваць, — спадзяецца Уладзіслаў. — Нешта іх цікавіць, але нешта і не падабаецца. У нас усе ўмовы створаны: і душавыя працуюць, і пральныя машынкі. Каб было ўсё ідэальна, трэба яшчэ грошы ўкладваць, пабудаваць некалькі хлявоў, аўтаматызаваць працу. Ёсць, куды рухацца. На жаль, не заўсёды ўсё атрымліваецца, як таго хочаш. Раённыя службы падказваюць, дзе мы што не дацягнулі, не дагледзелі. Стараемся гэта ўлічваць. А школьнікі, дарэчы, у нас за дзесяць дзён зарабілі па 300 рублёў. Нядрэнныя грошы.

### ДЛЯ АДПАЧЫНКУ — СУЧАСНЫЯ ЎМОВЫ

Уладзіслаў паспеў пабыць ветурачом, прадпрымальнікам, цяпер працуе дырэктарам.

Розныя ролі, задачы...

— Лягчэй там, дзе няма адказнасці, — усміхаецца ён. — Прадпрымальнік працуе сам на сябе, а тут адказнасць за людзей, жывёлу, трэба думаць пра заробак для работнікаў, планаваць наступны дзень — хто што будзе рабіць. І так пастаянна ў думках пра работу. Найлепшы сродак аднавіць сілы для мяне — гэта сон. Пасля хуткага ўсё становіцца на свае месцы. Нездарма кажуць, што раніца за вечар мудрэйшая. Вельмі карысна бывае сустрэцца з сябрамі або, напрыклад, схадзіць у лазню. Добра — сястра ў Слаўгарадзе жыве, і ў яе свая лазня. Па суботах хаджу да яе ў госці. Зімой гарадскую лазню з сябрамі наведваем, там ёсць басейн.

— Жыць у сельскай мясцовасці не ўсім па душы, — адзначае малады кіраўнік. — Але, калі тут будзе будавацца жыллё і месца работа, то знойдуцца ахвотныя застацца. Вось у Слаўгарадзе плануюць пабудаваць вялікі спартыўны комплекс з басейнам. Гэта плюс. Будзе дзе правесці вольны час з карысцю.

— А чаго не хапае Слаўгараду, каб моладзі было камфортна? — цікаўлюся я.

— Каварня патрэбная, рэстаран. У Слаўгарадзе ёсць невялічкая каварня, але гэта не тое. У нас у раёне распасюджаны адпачынак з выездам на прыроду. Таму і аграсядзіб дастаткова. Гэты кірунак актыўна развіваецца.

— І кінатэатр слаўгарадскі пажадана было б зрабіць больш сучасным, — дадае Людміла. — А то там нават рэпертуар стары. Я, напрыклад, люблю хадзіць у кіно, але тут для мяне няма нічога цікавага. І для дзяцей нічога прыстойнага няма. Добра было б і для моладзі стварыць сучасныя ўмовы для адпачынку. Каб яны не цягнуліся кудысьці, а ўсё атрымлівалі тут, на месцы.

### ВУЧЫЦЦА АДАПТАВАЦЦА ДА НАДВОР'Я

У гаспадарцы 2,5 тысячы раллі — 1,5 тысячы займае збожжавая група, 700—800 гектараў — азімыя зерневыя, яшчэ столькі ж — яравыя.

— Сянаж часткова загортваем у палімер, частково складваем у сянажныя ямы, — расказвае спецыяліст тэхналогію. — Звярнулі ўвагу, што корм лепш захоўваецца ў палімеры. Таму і робім на ім акцэнт. Сёлета болей чым дзве тысячы сенажу закруцілі ў плёнку. 100 гектараў бяспокрыўных пасеялі люцэрны. Абнавілі траваны баланс і ўбачылі, што ёсць вынік. На наступны год будзем абнаўляць некалькі ўчасткаў агульным памерам 150 гектараў.

— Год сёлетні быў, канешне, капрызны, мы гэта добра адчулі, — канстатуе суразмоўнік. — Паўтара ўкосу травы знялі і не дацягнулі планку па сенажы. Але ў сувязі з тым, што ў нас пераходзяцца кармы, гэтую зіму перазімуем са спакойнай душой. Для сябе зрабіў выснову: трэба вучыцца адаптавацца да надвор'я і шукаць такія сарты траў, якія будуць радаваць. Не на канюшыну рабіць акцэнт, а на нешта накшталт райграсаў, якім менш патрэбна вільгаці для развіцця. Яравыя таксама сеялі пры недахопе вільгаці ў глебе, і развіццё іх было горшае. Сёлета азімыя пасеялі яшчэ да заканчэння належных тэрмінаў. З насеннем не было пытанняў, загадзя ўсё падрыхтавалі.

### «ЦВЯРОЗА АЦЭНЬВАЮ СВАЕ МАГЧЫМАСЦІ»

Стаць годным кіраўніком — такая запаветная мара ў дырэктара калгаса. Ён глядзіць на мяне і тлумачыць:

— Лічу, што вопыту і ведаў пакуль не хапае, трэба вучыцца. Наведваў шмат розных раёнаў, арганізацый, бачыў, як працуюць іншыя, і цвяроза ацэньваю свае магчымасці. Трэба спачатку рэалізаваць задуманыя планы, зрабіць фермы больш сучаснымі. Цяпер ёсць новыя пасяўныя агрэгаты, якія дазваляюць некалькі аперацый рабіць адначасова. Гэта мінімізуе і сілы, і выдаткі, і тэхнічныя сродкі. Можам адразу і сеяць, і ўгнаенні ўносіць, і араць. Гэта тэхніка дарагая, але бяром на пробу і робім высновы. Калі вынік добры, тэхніка сябе хутка акупіць. Пакольку людзі не вельмі актыўна ідуць у сельскую гаспадарку, такая тэхніка для нас — знаходка.

— А нейкія рацыяналізатарскія ідэі па спрашчэнні тых ці іншых задач былі?

— Былі ідэі, якія дазволілі дасягнуць вынікаў пры вырошчванні цялят. Перабудаваліся ў тым, што сталі прымяняць выпойванне пры нараджэнні цяляці ў першую гадзіну і індывідуальныя домікі. У сувязі з гэтым скарацілася вытворчае выбыццё і паказчыкі палепшыліся.

— Для кіраўніка сельскагаспадарчай арганізацыі маладосць — гэта недахоп або плюс?

— Хутчэй недахоп. Калі кіраўнік малады, то і каманда павінна быць маладой. Не заўсёды сыходзімся ў меркаваннях са старэйшымі спецыялістамі. Яны часцей за ўсё жывуць ранейшымі катэгорыямі і цяжка пагаджаюцца на новае. Мы, канешне, знаходзім кампраміс, але пераканаць бывае складана. Цікаўлюся вопытам суседзяў, праглядаю на YouTube, як яны працуюць. Мне бліжэй інфармацыя па фермерах, мы ж маленькая гаспадарка. У сваім родзе ўнікальная. Глядзім, што ў іншых, эксперыментуем і робім высновы, як працаваць далей. Наперадзе зіма, камбайны ўжо пастаўлены на захаванне, дзфекатоўка праведзена, ведаем, што трэба прыкупіць, каб вясной быць цалкам гатовымі да бітвы за новы ўраджай.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота Святланы РЫЖАНКОВАЙ і аўтара.**

*Праект створаны пры фінансавай падтрымцы ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта № 131 ад 31 сакавіка 2022 года.*

# ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «БЕЛГРАН»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Аппарат для нагрева и охлаждения воды YLR2-5-X, инв. № 1697_; Водонагреватель EPPV-27, инв. № 1666; Водонагреватель электрический Timberk SWH MS2 10 H, инв. № 6346; Аппарат для нагрева и охл. воды YLR2-5-X, инв. № 1697 | 181,44 | 18,14 | 9,07 |
| 2 | Принтер HP LaserJet Pro MFP M132a RU (G3Q61A) A4, белый, инв. № C-27426; Принтер HP LaserJet P1102, инв. № 8888; Принтер Kyocera KM-1635, инв. № 650; Принтер Canon i-sensys, инв. № 679; Принтер Canon LBP2900, инв. № 601; Принтер Canon i-sensys, инв № 600; Принтер LaserJet P1005, инв. № 1829; МФУ Canon MG 2440; Принтер МФУ HP LaserJet M1132, инв. № 687; МФУ Canon i-sensys MF4750 с картриджем, инв. № 5270; Принтер Canon i-sensys LBP3010B, инв. № 677; Принтер лазерный HP Laserjet 1010, инв. № 1827 | 1204,32 | 120,43 | 60,22 |
| 3 | Зеркало, инв. № 413; Зеркало, инв. № 413 | 10,56 | 1,06 | 0,53 |
| 4 | Комплекты мебели бухгалтерия 1. Шкаф для документов со стеклом, 2 шт.; Комплекты мебели бухгалтерия 2. Шкаф для документов закрытого типа, 6 шт.; Комплекты мебели бухгалтерия 3. Шкаф с полками для одежды, 2 шт.; Комплекты мебели бухгалтерия 4. Тумба офисная, 3 шт.; Комплекты мебели бухгалтерия 5. Стол письменный, 4 шт.; Комплекты мебели бухгалтерия 6. Тумба под стол, 3 шт.; Комплекты мебели бухгалтерия 7. Стол овальный; Комплекты мебели бухгалтерия 8. Комод; Комплекты мебели бухгалтерия 9. Приставной стол (инв. № 1860) | 651,84 | 65,18 | 32,59 |
| 5 | Аппарат факсимильный PANASONIK KX-FC966, инв. № 1720; ИБП Powerex VI650LED, инв. № 9719; Факс Panasonic; Телефонный аппарат Panasonic KT-TS, инв. № 247; Радиотелефон Panasonic KT-TG, инв. № 312; Телефон сотовый GSM Nokia X 16Gb, инв. № 853; Телефон сотовый ZTE F327S черный,с/н 864581034946230, инв. № 13205; Телефон сотовый Huawei P40 lite E полночный черный, с\н 864754042565363, инв. № 12966; Телефон сотовый Huawei P40 lite E полночный черный, с\н 864754043711222, инв. № 12967 | 197,76 | 19,78 | 9,89 |
| 6 | Тепловентилятор эл. Scoole SC FH, инв. № 11447; Тепловентилятор эл. Scoole SC FH SP 20 02, инв. № 11447; Нагреватель воздуха электр. Ecoterm EHR-03/1E, инв. № 12373 | 25,44 | 2,54 | 1,27 |
| 7 | Эл. обогреватель масл. термия, инв. № 918, Эл. обогреватель масл. термия; Эл. обогреватель масл. «Термия», инв. № 914; Обогреватель масляный «Термия»; Эл. обогреватель масл.термия, инв. № 916; Эл. обогреватель «Термия», инв. № 907; Обогреватель; Обогреватель | 147,36 | 14,74 | 7,37 |
| 8 | Сейф ASM.63.T-EL, инв. № 114; Сейф BS-T750, инв. № 110; Сейф ASM.63T-EL, инв. № 111; Сейф ASM.63.T-EL, инв. № 113 | 681,60 | 68,16 | 34,08 |
| 9 | Калькулятор CITIZEN CDC444S, инв. № 8540; Калькулятор Citizen, инв. № 228; Калькулятор Citizen SDC-554S, инв. № 456; Калькулятор Citizen SDC-664S, инв. № 928; Калькулятор 16-разр. Rebell SDC-664, инв. № 8884 | 29,76 | 2,98 | 1,49 |
| 10 | Холодильник АТЛАНТ МХМ 162, инв. № 1640; Холодильник INDESIT TT85.001-WT, инв. № 1642; Холодильник «Атлант» 2822-80, инв. № 1640 | 292,80 | 29,28 | 14,64 |
| 11 | Монитор Philips, инв. № 630; ПЭВМ с монитором, инв. № 673; ПЭВМ «FerCom» в комплекте с монитором 22» Filips 226v4lab/00, инв. № 1806; ПЭВМ FeRCOM исп. «Бизнес», инв. № 1692; Монитор LG, инв. № 636; ПЭВМ, инв. № 674; ПЭВМ, инв. № 661; ПЭВМ, инв. № 1071; ПЭВМ, инв. № б-н; Монитор Samsung, инв. № 661; ПЭВМ ICS в комплекте с монитором 17 Philips 170 S7FS, инв. № 656; ПЭВМ БС Лейсан системс Ceieron 351J в комплекте с монитором 17 Philips 170S7FS, инв. № 624; Колонки Logitech LS-11, инв. № 881; Монитор Philips, инв. № 620; ПЭВМ, инв. № 1779; Компьютер с монитором, инв. 1901, инв. № 1901; ПЭВМ т.м. Clelron «MAXIMA», инв. № 1901*/2; МОНИТОР 17 Philips 170 S7FS, инв. № 631; КОМПЬЮТЕР ЛОГОС А5000 в комплекте с монитором SAMSUNG 20, инв. № 646 | 401,28 | 40,13 | 20,06 |
| 12 | Шкаф со стеклом, инв. № 1855/1, Угловая полка (набор мебели каб. юриста), инв. № 1859; Шкаф гардеробный, инв. № 1855/3; Стол с вырезом и тумбой, инв. № 1855/4 | 129,12 | 12,91 | 6,46 |
| 13 | Часы, инв. № 1644; Часы, инв. № 1644; Глобус-бар, инв. № 365; Банкетка, инв. № 4847; Вешалка напольная, инв. № 533; Набор настольный (бордовый 7 предметов) Латвия, инв. № 6388 | 182,40 | 18,24 | 9,12 |
| 14 | Печь СВЧ, инв. № 1462, Холодильник MPM-46-CJ-02, инв. № 1734; Эл. плитка ENERGY EN-901, инв. № 11765; Эл.чайник Skarlett SC-1025, инв. № 4535; Кофемашина автоматическая Saeco Syntia, инв. № 1000_ | 303,36 | 30,34 | 15,17 |
| 15 | Огнетушители, инв. № 317, 318, 3 шт.; Огнетушитель ОП-4, инв. № 237, 3 шт. | 63,36 | 6,34 | 3,17 |
| 16 | АКБ-7А-ч GB12-7 Uhom-12B, инв. № 6836; Маска сварщика ADF 600S, инв. № 100788; Отвёртка электробезопасности до 100, инв. № 7655; Клещи токоизмерительные м-266, инв. № 1075; Бензопила Stihl; Преобразователь тока (инвертор) Actimax | 236,64 | 23,66 | 11,83 |
| 17 | Блескомер WGG60-S, инв. № 451 | 960,00 | 96,00 | 48,00 |
| 18 | Ноутбук HP G72-b01ER, инв. № 663; Маршрутизатор Keenetic Lite, инв. № 100841; Ноутбук HP Envy 17-Joder, инв. № 1634; Ноутбук HP Envy 470 GO, инв. № 1636; Ноутбук HP Envy 470 GO, инв. № 1636*; Нетбук Samsung; Маршрутизатор Keenetic KN 1711, инв. № 100842 | 639,84 | 63,98 | 31,99 |
| 19 | Комплект мебели (кабинет директора) 1. Набор шкафов; Комплект мебели (кабинет директора) 2. Стол руководителя; Комплект мебели (кабинет директора) 3. Стол для совещаний; Комплект мебели (кабинет директора) 4. Тумба; Комплект мебели (кабинет директора) 5. Керамический горшок (инв. № 1866); Комплект штор д/кабинета дир., инв. № 1400 | 698,40 | 69,84 | 34,92 |
| 20 | Комплект мебели (гостевая) 1. Кухонный шкаф-стол; Комплект мебели (гостевая) 2. Кухонный модуль, 2 шт.; Комплект мебели (гостевая) 3. Кухонная столешница; Комплект мебели (гостевая) 4. Полка, 3 шт.; Комплект мебели (гостевая) 5. Журнальный столик (инв. № 1866*); Комплект штор д/гостевой дир., инв. № 1404 | 83,04 | 8,30 | 4,15 |
| 21 | Комплект мебели (главный инж.) 1. Стол для переговоров; Комплект мебели (главный инж.) 2. Стол; Комплект мебели (главный инж.) 3. Приставка к столу; Комплект мебели (главный инж.) 4. Тумба; Комплект мебели (главный инж.) 5. Шкаф для документов; Комплект мебели (главный инж.) 6. Шкаф гардеробный, 2 шт.; Комплект мебели (главный инж.) 7. Шкаф со стеклом (инв. № 1861) | 383,04 | 38,30 | 19,15 |
| 22 | Комплект мебели (кабинет зам. дир. по строительству) 1. Шкаф-витрина; Комплект мебели (кабинет зам. дир. по строительству) 2. Шкаф со стеклом, 2 шт.; Комплект мебели (кабинет зам. дир. по строительству) 3. Угловой стол; Комплект мебели (кабинет зам. дир. по строительству) 4. Тумба (инв. № 2962) | 537,12 | 53,71 | 26,86 |
| 23 | Комплект мебели (приемная)+обогреватель Каскад 1. Рецепшен, 2 шт.; Комплект мебели (приемная)+обогреватель Каскад 2. Обогреватель; Комплект мебели (приемная)+обогреватель Каскад 3. Тумба; Комплект мебели (приемная)+обогреватель Каскад 4. Шкаф гардеробный; Комплект мебели (приемная)+обогреватель Каскад 5. Шкаф со стеклом, 4 шт.; Комплект мебели (приемная)+обогреватель Каскад 6. Тумба с роллетом (инв. № 1853); КСА Миника-НТС 1102Ф, инв. № 5890; Вешалка м15, инв. № 276 | 451,20 | 45,12 | 22,56 |
| 24 | Стол фрезерованный с пропуском на хром. опорах, инв. № 6839; Печь микроволновая HORIZONT 20MW800-1479, инв. № 1790; Стол прямой 145*56*91, инв. № 1862/4; Эл. чайник Bosch, инв. № 1308 | 168,96 | 16,90 | 8,45 |
| 25 | Шкаф для документов со стеклом, инв. № 6850; Подставка под системный блок подкатная 250*480*120, инв. № 6845; Тумба 83*80*40, инв. № 1862/6; Тумба 83*80*40, инв. № 1862/6*; Шкаф для документов | 108,96 | 10,90 | 5,45 |
| 26 | Монитор LG, инв. № 637; Принтер лазерный SENSYS LBP3000, инв. № 602; Принтер Samsung; Монитор Samsung, инв. № 661; Копировальный аппарат CANON FC 128, инв. № 668; Принтер HP LJ 1010, инв. № 1821; Монитор 17 LG 1718S, инв. № 629; ПЭВМ ICS в комплекте с монитором Samsyng SyncMaster 943, инв. № 660; Принтер XEROX | 361,44 | 36,14 | 18,07 |
| 27 | Вентилятор FA-5557 напольный, инв. № 1376; Печь м/в («Горизонт»), инв. № 1485; Эл. обогреватель «Термия» | 59,04 | 5,90 | 2,95 |
| 28 | Ваза Габбро полир. Высота 250 мм ЭН, инв. № 8648; Ваза Габбро б-н, инв. № 7189; Бетонная полуваза, инв. № 9617; Бетонная полуваза, инв. № 9618 | 1209,60 | 120,96 | 60,48 |
| 29 | Подшипники по описи 10,5 в ассортименте (480 шт.); Подшипник качения 1680207AK10C17(RU), 2 шт., инв. № 101710 | 4514,40 | 451,44 | 225,72 |
| 30 | Угольник УШ 630х400 3 шт., инв. № 48; Пика для отбойного пневмомолотка, 6 шт., инв. № 55; Пика к отб. молотку (МО-2,3,4), 3 шт., инв. № 1324; Пика-зубило П-31 к отб. молотку(МО-2), 2 шт., инв. № 209; Катушка МО-100Б 380В ПВ 100, 1 шт., инв. № 7618; Кольцо А55 20 шт., инв. № 1012; Кольцо А80 20 шт., инв. № 1024; Кольцо Б35 30 шт., инв. № 1025; Фильтр комбинированный РУ-60М марка А1Р1D 12 шт., инв. № 6522 | 554,40 | 55,44 | 27,72 |
| 31 | Щетка абразивная 320 36 шт., инв. № 1754; Щетка абразивная 46 50 шт., инв. № 1752; Щетка абразивная 120 48 шт., инв. № 1753; Щетка абразивная 500 12 шт., инв. № 1754 | 1576,80 | 157,68 | 78,84 |
| 32 | Линейка изм.1000 мм b40 2 шт., инв. № 459; Линейка изм. 300 мм 7 шт., инв. № 588; Линейка изм. 500 мм 3 шт., инв. № 593; Рамка 2-м верт. EEM-V-302-20, инв. № 1441; Рамка 2-м верт.EEM-V-302-10, инв. № 1442; Рамка 2-м гориз. EEM-G-302-20 10 шт., инв. № 1443; Рамка 3-м верт. EEM-V-303-20 4 шт., инв. № 1444; Рамка 3-м гориз. EEM-G-303-20 2 шт., инв. № 1445; Рамка 4-м верт.EEM-V-304-10 2 шт., инв. № 1446; Рамка 4-м гориз. EEM-304-20 3 шт., инв. № 1447; Рамка 4-м гориз. EEM-G-304-10, инв. № 1448; Розетка 1-м EET01-034-20 5 шт., инв. № 1449; Розетка 1-м RJ-45 EEK01-035-20 5 шт., инв. № 1450; Розетка 1-м EEA00-027-20 2 шт., инв. № 1451; Розетка 2-м EET01-134-20 2 шт., инв. № 1452; Розетка RJ-45 EEK00-135-10 5 шт., инв. № 1453; Розетка 1-м EEA00-027-10 3 шт., инв. № 1455; Выключатель 2-кл с индикатором 10А (11 шт.), инв. № 1440; Коробка разветвител.108х108х58 КС 7 шт., инв. № 1457; Гигрометр ВИТ-1, инв. № 164; Устройство ИЗУ 70-400 10 шт., инв. № 1500; Выключатель ВА 47-63-3 25А 3 шт., инв. № 1497; Доводчик № 3 бол. до 80 кг серый, инв. № 6486; Разъем РШ-ВШ-30 25А 8 шт., инв. № 1282; Коробка уст. СП 68-40 5 шт., инв. № 1456 | 218,38 | 21,84 | 10,92 |
| 33 | Круг шлиф. 63*20*20 (991), инв. № 3622; Сальник 240х280 (1902), 82 шт., инв. № 947; Инструмент гибкий шлиф. Д100№Р 6 шт., инв. № 1248; Алмазный гибкий шлифовальный круг д 100 2 шт., инв. № 5311; Инструмент гибкий д100 р Т 2 шт., инв. № 1590; Инструмент гибкий шлифовальный (3 шт.), инв. № 1328; Уплотнение вала 65х85х10 RST 7 шт., инв. № 3731; Виброметр; Инструмент алмазный на орг. связ. станд. 28-20 1,72 шт., инв. № 12932; Инструмент алмазный шлиф. Стандарт из синтетич. алмазов Д250, АС 200/160, 2 шт., инв. № 9897; Инструмент алмазный на органической связке стандарт д 250 200-160, инв. № 9897; Полировальник ф 200 мм, инв. № 1487; Фреза алмазная ФАШ д 200 гринт люкс, инв. № 1339; Инструмент шлиф. ф 200х22р 7/5 АП-1 2 шт., инв. № 1424; Инструмент шлиф. ф200х22р 5/3 АП-1, инв. № 1425 3 шт., инв. № 1425; Полировально-шлиф инстр. д 190-200, 8 шт., Инструмент АС ф 190 28/20 60к тип «Чашка», инв. № 1240; Инструмент АС ф190 40/28 тип «Чашка», 4 шт., инв. № 1241; Инструмент АС ф190 28/20 тип «Чашка» 2 шт., инв. № 1242; Инструмент АС ф190 14/10 тип «Чашка», инв. № 1246 | 891,50 | 89,15 | 44,57 |
| 34 | Микроволновка Midea, инв. № 1462; Огнетушитель 5 шт.; Напольное покрытие 3м2 (Резиновый настил), инв. № 132; Термовоздуходувка GHG660, инв. № 4510; УШМ DeWalt; Набор головок и бит 94 пр. 1/4", 1/2" PRO STARTUL NEW CASE, инв. № 12378; УШМ Makita; Тепловентилятор ARESA 2000 Вт, инв. № 12099; Эл. обогреватель масл. «Термия», инв. № 913_*; Ящик силовой ЯБЗ-250-3р с пред., инв. № 1522; Огнетушитель ОП-8 (10), инв. № 176; Огнетушитель ОП-4 з МИГ, инв. № 317; Огнетушитель ОУ-3, инв. № 318; Огнетушитель, 2 шт.; Конвектор Ballu BEC/SM-1000/арт.128679, инв. № 12055; Лопата штыковая 205400 мм с ребрами жесткости Startul Garden, инв. № 11820; Эл. обогреватель «Термия», инв. № 913; Конвектор эл. Термия ЭВНА 2,0/230 С2 2,0 с ножками опорными, инв. № 101226, 101227; Перфоратор BOSCH GBH 2-24, инв. № 499; Аккумуляторная батарея, инв. № 4272; Аккумуляторная батарея, инв. № 11284; Аккумуляторная батарея СТАРТ.БАТ 6СТ-190 (2 шт.), инв. № 9316 | 1138,32 | 113,83 | 56,92 |
| 35 | Круг истирания ЛКИ-2; Инструмент алмазный на органической связке стандарт д 250 80-63, инв. № 9898; Инструмент алмазный на органической связке стандарт д 250 60-40, инв. № 101411; Инструмент алмазный на органич. связке Стандарт Д 200 АС 40/28, инв. № 101410; Инструмент алмазный на органич. связке Стандарт Д200 АС 14/10, инв. № 12933; Инструмент алмазный на органической связке стандарт д 200 200-160, инв. № 12929; Инструмент алмазный на органической связке стандарт д200 14-10, инв. № 12933; Инструмент алмазный на орган связке Fikert 140 600, инв. № 100979; Круг гибк. пол. ф 125мм мокрый 12 шт., инв. № 1528; Алмазный элемент 400 Fikert 140, инв. № 1352; Инструмент АС F600 40/28 Fikert140 2 шт., инв. № 1315; Инструмент АШ 14/10 Fikert140 (5 шт.), инв. № 1582; Диск алмазный шлиф из синт алмазов, 2 шт., инв. № 6289; Инструмент шлиф. ф100 80-63 улитка, 4 шт., инв. № 1342; Инструмент шлиф. ф250х12 5/3, инв. № 1477 | 1606,32 | 160,63 | 80,32 |
| 36 | Удлинитель на катушке 10 м, инв. № 1461; Удлинитель УХ1-25 30 м, инв. № 1524; Угольник УШ 250х160, инв. № 223; Угольник 400мм 3431-40 z01, инв. № 4826; Щетки угольные к-т 6,3х8х15мм Flex, инв. № 11169; Редуктор БПО-5-4м попановый (для бытового назначения) Редиус 168, инв. № 10462; Горелка д/обжига камня 150 ММ, 2 шт., инв. № 1749,18 | 110,88 | 11,09 | 5,54 |
